
ХАРАКТАР ПЕРАМОЖЦЫ
Сямейная газета



МОДА НА СЯМ'Ю ПРАЙШЛА?
Сямейная газета




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

7 КАСТРЫЧНІКА 2021 г. ЧАЦВЕР № 193 (29562)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Анатоль СІВАК, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«У будаўніцтве, як і ў любой сферы, ключавую ролю адыгрывае эканоміка. Ёсць юрыдычныя асобы, якія займаюцца гэтым бізнесам, і яны не заўсёды фінансава ўстойлівыя. Гэта асноўнае пытанне, якое генерыруе праблемы. Не заўсёды яны разлічваюць свае сілы пры рэалізацыі праектаў. Наша задача — прадугледзець негатыўныя тэндэнцыі і шукаць шляхі іх выпраўлення. Гэта могуць быць у тым ліку абмежавальныя меры на рост цэн будаўнічых матэрыялаў. Плюс сам допуск на рынак гульцоў. Трэба імкнуцца даваць пляцоўкі тым падрадчыкам, якія маюць сур'ёзную матэрыяльна-тэхнічную базу і вопыт у будаўніцтве, што вымяраецца не гадамі, а дзесяцігоддзямі».*

# НА ВЫШЫНІ



Фота БелТА.

Беларускі металургічны завод працягвае рэалізацыю праекта «Комплексная рэканструкцыя пылагазаўлоўлівальнай устаноўкі (ПГУ-3)». Для яго завяршэння з 5 кастрычніка спынена работа дугавой сталеплавільнай печы № 3. За час прыпынку будзе праведзена рэканструкцыя існуючай сістэмы ўлоўлівання і ачысткі газаў, якія адыходзяць ад печы, з будаўніцтвам новай пылагазаўлоўлівальнай устаноўкі. Будуць устаноўлены новыя дадатковыя рукаўны фільтр і паддахавы парасон, а таксама сістэма маніторынгу выкідаў шкодных рэчываў у атмасферу. Усё гэта ў комплексе дасць магчымасць знізіць аб'ёмы выкідаў ад сталеплавільнай печы № 3 на 460,41 т/год. На здымку: мантажнік Васіль БЯЛОЦКІ.

## КОРАТКА

- Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна з днём нараджэння.
- **Фіналісткі конкурсу «Міс Беларусь» выйшлі на подыум разам з бяздомнымі жывёламі.**



- У Мінску шэрыя рыэлтары падманулі не менш за дзесяць чалавек на Br850 тысяч.
- **У Віцебскай вобласці распрацуюць маршруты тураў для інклюзіўных турыстаў.**
- У Гродне стартавала кампанія па вакцынацыі ад COVID людзей без пэўнага месца жыхарства.


ISSN 1990 — 763X


Добрая навіна

## СІСТЭМА «СВОЙ — ЧУЖЫ» І ШТУЧНЫ ІНТЭЛЕКТ

### Што яшчэ прадугледжвае новая школа ў Стоўбцах



**Пры ўваходзе ў Стаўбцоўскую сярэднюю школу № 4 гасцей «сустракае» камень з надпісам, які сведчыць, што тут 17 ліпеня 2020 года закладзена капсула з сімвалічным пасланнем нашчадкам з нагоды пачатку будаўніцтва ўстановы адукацыі. Гэтая школа месціцца ў мікраараёне шматпавярховай жылой забудовы. Тут жыве шмат маладых, вялікіх сем'яў. Раён працягвае актыўна забудоўвацца, прырастае новымі дамамі.**


СТАР. 2


Па палічках

## Не чакайце, пакуль шэрае стане белым

### Калі заробак «у канверце», вы заўсёды ў мінусе

**Дзякуючы сацыяльнай рэкламе ўсе ведаюць: сёння атрымліваеш заробак «у канверце», заўтра не далічышся пенсіі. Хтосьці скажа: калі яшчэ прыйдзе тое заўтра. Але ёсць нямала прыкладаў, калі «шэрыя» даходы добра псуюць жыццё задоўга да выхаду на пенсію. Чым рызыкуе чалавек, пагадзіўшыся атрымліваць зарплату «ў канверце», наколькі распаўсюджаная гэта з'ява, распавёў Юрый РЭБКАВЕЦ, першы намеснік начальніка Мінскага гарадскога ўпраўлення ФСАН.**




СТАР. 3

Парламенцкі дзённік

# Сіла народнай дыпламатыі

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава сустрэлася ўчора з украінскімі палітыкамі Аляксандрам Марозам, Аляксеем Бeражным і Васілём Цушко.**



«Украіна заўсёды была і застаецца для нас блізкай суседкай, той краінай, з якой нас звязваюць доўгія гады дружалюбных, родных адносін. І ўкраінскі народ заўсёды быў родным для нас. У гэтым няма ніякага сумневу і гэта сапраўды так. Вы ведаеце, што мы заўсёды радаваліся тым адносінам, якія складваліся паміж нашымі краінамі, той падтрымцы, якая была ў міжнародных арганізацыях, калі праходзілі сустрэчы на высокім і вышэйшым узроўні, калі ў нас складваліся добрасуседскія адносіны. Сёння па ініцыятыве ўкраінскага боку гэтыя адносіны пастаўлены на паўзу, на жаль. Але ўсё роўна супрацоўніцтва засталося — гандлёва-эканамічныя, культурныя сувязі, а самае галоўнае — народная дыпламатыя. Гэта самае важнае. Як беларускі народ ставіцца па-добраму да ўкраінскага, так і ўкраінскі — да беларускага. І ў гэтым няма ніякага сумневу. Упэўненая, што сённяшняя сітуацыя часовая і цвярозы розум возьме верх», — сказала Наталля Качанава.

Паводле яе слоў, гэты візіт дазволіць украінскім палітыкам азнаёміцца з рэальнай сітуацыяй у нашай краіне. «Пэўныя падзеі, якія адбыліся ў Беларусі летась, не могуць нас не турбаваць сёння. І вы ведаеце рэакцыю некаторых краін на гэтую сітуацыю. Але лепш не чуць, а паглядзець, што на самай справе адбываецца. Таму дзякуй, што вы прыехалі да нас, каб паглядзець, як развіваецца наша краіна, на сацыяльна-эканамічнае развіццё, грамадска-палітычнае становішча», — адзначыла Наталля Качанава, выказаўшы ўпэўненасць, што госці данясуць рэальную сітуацыю пра нашу краіну людзям цвярозага розуму, якіх шмат ва Украіне. «Народная дыпламатыя вельмі важная. Хоць многія не ведаюць і так: мы ж маем зносіны, людзі прыязджаюць, мы абменьваемся думкамі. Маецца шмат гадоў-пабрацімаў, у папярэднія гады падпісаныя дагаворы аб супрацоўніцтве паміж імі, і людзі сапраўды супрацоўнічаюць», — сказала яна.

«Мы, шчыра кажучы, збіраліся наведаць Беларусь і не меркавалі, што будзем сустракацца з вышэйшым кіраўніцтвам. Рэалізоўваючы ідэю народнай дыпламатыі, мы хацелі ўбачыць, як людзі жывуць на месцах, чым займаюцца, якое грамадскае жыццё ў Беларусі, як развіваюцца вытворчасці. Таму што аб'ектыўнай інфармацыі замала ў нас, мякка кажучы», — сказаў Аляксандр Мароз, падзякаваўшы старшыні верхняй палаты беларускага парламента за прыём.

«Мы лічым, што людзі павінны мець зносіны метадамі народнай дыпламатыі, каб кожны для сябе рабіў высновы, якая павінна быць перспектыва, — растлумачыў Аляксандр Мароз журналістам. — Сёння каля 106 тысяч украінцаў у вас працуе, і гэта шмат пра што кажа. Людзі шукаюць сабе прыстанішча, каб была работа, перспектыва на жыццё. Сацыяльная абароненасць людзей адчуваецца ў Беларусі, і гэта трэба шанаваць. Нам ва Украіне трэба, каб людзі не ўцякалі са сваёй краіны. Метадамі народнай дыпламатыі можна даць зразумець, як можна пераўтварыць сваё жыццё. Перакананы, што многае, што робіцца ў Беларусі, будзе нам карыснае».

**Паводле БелТА.**

Інтэграцыя

# Нам па дарозе

## Прэм'ер-міністр Беларусі Раман Галоўчанка сустрэўся з міністрам транспарту Расіі Віталіем Савельевым

**«Транспартная сфера — адна з жывых сфер супрацоўніцтва, якая звязвае нашы краіны. У нас вялікі груза- і пасажырапаток, транзітны грузапаток, таму невыпадкова, што пытанні развіцця транспартнай сферы з'яўляюцца адным з элементаў саюзных праграм, якія былі не так даўно падпісаныя кіраўнікамі ўрадаў Беларусі і Расіі», — адзначыў прэм'ер-міністр.**



Паводле яго слоў, у Беларусі дадзеная сфера вельмі рэсурса- і капіталаёмістая. «Ад яе залежаць бесперабойныя пастаўкі тавараў, перамяшчэнне грамадзян, таму падтрыманне кантактаў і дыялогу ў гэтай сферы вельмі важнае. Асабліва для нашай краіны гэта важна з улікам міжнароднага ціску, які аказваецца абсалютна несправядліва, у прыватнасці, уведзеныя абмежаванні ў авіяцыйнай сферы, якія з'яўляюцца анамальнымі і супярэчаць усім нормам міжнароднага права», — цытуе прэм'ера БелТА. Раман Галоўчанка выказаў расійскаму боку словы ўдзячнасці за падтрымку ў згаданым пытанні.

«Мы актыўна развіваем супрацоўніцтва ў чыгуначнай сферы. Чыгункі Беларусі і Расіі паэтапна аднаўляюць пасажырскія зносіны. Гэту работу трэба прадаўжаць, нягледзячы на тое што эпідэмічная сітуацыя не дэманструе прыкмет перыяду паляпшэння. Што датычыцца грузавых перавозак, Беларусь — гэта экспарцёр, для нас вельмі важная ўстойлівая лагістыка для транспарціроўкі нашых грузаў, таму што дзве трэці выраблены ў краіне прадукцыі рэалізоўваецца на экспарт. А краіны, якія не маюць, як мы, выхаду да мора, вядома, павінны выбудоўваць эфектыўныя і ўстойлівыя маршруты для транспарціроўкі нашых грузаў», — адзначыў кіраўнік беларускага ўрада. У гэтай сферы, на яго думку, неабходна абмеркаваць з расійскім бокам рэалізацыю наступнага этапу па актывізацыі беларускіх грузапатокаў праз інфраструктуру Расіі.

Паводле інфармацыі прэм'ер-міністра, за 8 месяцаў 2021 года ў чыгуначных зносінах з Расіяй перавезена 27 млн тон грузаў, або 104 працэнты да ўзроўню мінулага года. «Дадатная дынаміка захоўваецца ў тым ліку ў рамках падпісанага намі сёлета міжурадавага пагаднення аб перавалцы беларускіх нафтапрадуктаў. Дзякуй расійскім калегам за тое, што ўдалося ў кароткі час забяспечыць практычнае выкананне гэтага пагаднення і аператыўна выбудаваць дзейсную схему з улікам эфектыўнай лагістыкі і эканамічнай выгады для ўсіх бакоў. Я думаю, што на базе гэтага паспяховага прыкладу мы выбудуем работу і па іншых напрамках», — падкрэсліў ён.

Раман Галоўчанка выказаў меркаванне, што абодвум бакам неабходна «зверыць гадзіннікі адносна далейшай стратэгіі развіцця аўтатранспартнай інфраструктуры». «Урад і Міністэрства транспарту Расіі шмат увагі ўдзяляюць менавіта стратэгічнаму планаванню як марскіх перавозак, так і паветраных і сухапутных. У Расіі плануецца рэалізацыя значных праектаў па будаўніцтве аўтамабільных дарог, у тым ліку якія могуць і, я ўпэўнены, будуць, звязвацца з беларускімі дарогамі, забяспечваючы ўстойлівы транзітны калідор па маршруце Кітай — Еўропа або Еўропа — Кітай. Таму важна сёння абмяняцца канкрэтнымі планамі, для таго каб мы выходзілі ў сваім планаванні на сінхронныя рашэнні», — падкрэсліў прэм'ер-міністр.

Міністр транспарту Расіі Віталій Савельеў, у сваю чаргу, выказаў гатоўнасць да дэталёвага абмеркавання ўсіх пытанняў і напрамкаў супрацоўніцтва.

# СІСТЭМА «СВОЙ — ЧУЖЫ» І ШТУЧНЫ ІНТЭЛЕКТ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

— Першага верасня школа расчыніла дзверы для юных навасёлаў. На сённяшні дзень у нас вучыцца 890 школьнікаў. Гэта дзеці не толькі з новага мікраёна. У кагосьці бацькі пераехалі з сельскай мясцовасці, іншых куткоў Беларусі і пабудавалі тут жыллё, частка малых перайшла з перанаселенай школы № 3, — расказала **дырэктар установы Ірына КЛАЧКО.**

У школе створаны ўсе ўмовы для гарманічнага духоўнага і фізічнага развіцця дзяцей. Тут ёсць майстэрні па апрацоўцы драўніны і металу, STEM-клас, сталовая на 240 месцаў, буфет, кабінет кулінарыі, басейн на чатыры плавальныя дарожкі, малая і вялікая спартыўныя залы, тры трэнажорныя залы, цір, тэнісная зала, фоталабараторыя, бібліятэка.




— Улічваючы, што гэта новая школа, мы мелі магчымасць абсталяваць у ёй Цэнтр бяспекі з улікам сучасных патрабаванняў, — кажа Ірына Яўгенаўна. — Тут праводзяцца заняткі па атрыманні навыкаў паводзін у розных экстрэмальных сітуацыях: пры пажары, галалёдзіцы, на вадзе, у быце. На манекенах вучні адпрацоўваюць аказанне першай медыцынскай дапамогі. Пачалі работу па стварэнні музея Якуба Коласа. Часткай экспанатаў падзяліліся музеі, якія працуюць на тэрыторыі нашага раёна. На кожным паверсе ёсць прасторныя холы. Кожны з іх будзе афармлены тэматычна. Напрыклад, адзін прысвечаны шахматам, дзе размешчаны адпаведныя фігуры ў рост чалавека. Мы пачалі весці летапіс «Школа ў аб'ектыве». Ужо напісаны першыя дзве старонкі — закладка капсулы і непасрэдна будаўніцтва. Такім чынам працягнем адзначаць усе значныя падзеі, што адбываюцца ва ўстанове адукацыі. У лагатыпе школы выкарыстаны валошкі, а наш дэвіз — «Адзінства ўсіх і ўнікальнасць кожнага».

Тэрыторыя вакол школы добраўпарадкавана, усё тут прадумана да дробязяў. Дзеці з задавальненнем бавяць час у спартыўным гарадку, дзе ёсць футбольнае поле са штучным пакрыццём, бегавыя дарожкі, гульнявая, валейбольная, баскетбольная пляцоўкі, пляцоўкі для заняткаў варкаўтам, для вывучэння правіл дарожнага руху. У школе прадугледжана безбар'ернае асяроддзе для навучання дзяцей з псіхафізічнымі асаблівасцямі развіцця: пандус, ліфт, мабільныя лесвічныя пад'ёмнікі, санвузлы, душавыя, абсталяваны спецыяльныя месцы ў вучэбных класах.

Чатырохпавярховы будынак аснашчаны сучаснай сістэмай бяспекі. Ахову нясе Дэпартамент пазаведамаснай аховы МУС, устаноўлены камеры відэаназірання. Нейрасетка вывучае відэазапісы, што дазваляе распазнаць небяспечныя сітуацыі, і сігналізуе аб іх ахоўніку. Сістэма «свой — чужы» будзе распазнаваць у школе старонніх людзей. Ноччу за парадкам і бяспекай будзе сачыць вартаўнік.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

### КАМЕНТАРЫЙ

**Дзяніс КОЛЕСЕНЬ, старшыня райвыканкама:**

— Узначаліўшы райвыканкам у 2018 годзе, пры знаёмстве з калектывам, я выказаў меркаванне, што кожны кіраўнік, заступаючы на пасаду, павінен мець мару. А гораду неабходна была новая школа, паколькі адна з наяўных — № 3 — была перагружаная, працавала ў дзве змены. І нам дазволілі пачаць праектаванне новай установы адукацыі. У ліпені 2020 года пачалі яе будаўніцтва з закладкі капсулы нашчадкам. За год здолелі рэалізаваць праект.

Нават у Мінску не ўсюды можна ўбачыць аб'ект з такой інфраструктурай і магчымасцямі, не кажучы ўжо пра раённы цэнтр. Школа была пабудавана за кошт абласнога і раённага бюджэтаў — 50 на 50 працэнтаў. Тэндар на будаўніцтва навучальнай установы выйграў Будтрэст № 1 горада Мінска. Гэтае прадпрыемства мае багаты вопыт узвядзення падобных аб'ектаў.

Ведай нашых!

# ГЭТА — САПРАЎДНЫ ПРАРЫЎ

**Інтрыга самых статусных спаборніцтваў у галіне IT вырашылася ў Маскве. Каманда факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ стала на чэмпіянаце свету па праграмаванні сярод студэнтаў (ICPC) сярэбраным прызёрам.**

У зборную БДУ ўвайшлі выпускнікі факультэта Ягор Дубовік, Фёдар Карабейнікаў і чацвёртакурснік Аляксандр Кернажыцкі. У фінале яны рашылі 11 задач з 15 прапанаваных. Сярэбраны медаль стаў калассальным прарывам беларусаў. Апошняя ўзнагарода чэмпіянату свету была заваяваная імі ў 2013 годзе. Дарэчы, хлопцы з БДУ ўвайшлі ў чацвёрку сярэбраных прызёраў: такія ж медалі заваявалі студэнты з Уроцлаўскага ўніверсітэта (Польшча), Кембрыджскага ўніверсітэта (Вялікабрытанія) і Бухарэсцкага ўніверсітэта (Румынія).

Па правілах ICPC, у фінале разыгрывалася па 12 прызавых месцаў: па чатыры залатыя, сярэбраныя і бронзавыя ўзнагароды. Абсалютнае першынство заваявала каманда Ніжагародскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. І. Лабачэўскага (Расія). Залатымі прызёрамі прызнаныя таксама студэнты Сеульскага нацыянальнага ўніверсітэта (Паўднёвая Карэя), Універсітэта ІТМО і Маскоўскага фізіка-тэхнічнага інстытута (Расія). «Бронза» на рахунку каманд Харкаўскага нацыянальнага ўніверсітэта радыёэлектронікі (Украіна), Ілінойскага ўніверсітэта (Урбан-Шампейн, ЗША), Вышэйшай школы эканомікі (Расія) і Масачусецкага тэхналагічнага інстытута (ЗША).

Усяго ў Маскве спаборнічалі 117 каманд з 63 краін свету. Ад Беларусі таксама выступіла зборная БДУІР, якая ў гэтым годзе ўвайшла ў шостую дзясятку фіналістаў.

За ўсю гісторыю ўдзелу ў чэмпіянаце ў скарбонцы БДУ залаты медаль (2004 год, Чэхія), «бронза» (2008 год, Канада) і дзве сярэбраныя ўзнагароды (2012 год — Польшча і 2013 год — Расія).

Наступны фінал ICPC адбудзецца ў лістападзе 2022 года ў Бангладэш.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Рэаліі віртуальнай прасторы

# Вас папярэджвалі: знойдуць усіх

## За абразлівыя словы з прычыны гібелі афіцэра КДБ затрыманы 136 чалавек

**Следчы камітэт расследуе крымінальную справу супраць 136 «ананімных каментатараў», якія рабілі хайп на гібелі афіцэра КДБ, распавялі БелТА ў СК.**

Як паведамлялася раней, 28 верасня пры выкананні службовых абавязкаў загінуў супрацоўнік Камітэта дзяржаўнай бяспекі. «Гэтая трагедыя шакавала грамадства. Большасць грамадзян выказвалі свае спачуванні і суперажывалі разам з сям'ёй і калегамі загінулага. Аднак знайшліся і тыя, для каго бяда стала падставай для хайпу. У сетцы сталі з'яўляцца каментарыі і відэаролікі, якія адзначаліся цынізмам. Нягледзячы на неаднаразовыя папярэджанні прадстаўнікоў праваахоўных органаў аб дачы жорсткай і прынцыповай прававой ацэнкі па кожным такім факце, некаторых «каментатараў» гэта не спыніла, і яны, спадзеючыся на ананімнасць і ўяўную беспакаранасць, працягнулі цкаванне, абразы і знявагі ў сетцы Інтэрнэт», — распавялі ў СК.

У цяперашні час Следчы камітэт расследуе крымінальную справу, узбуджаную па арт. 130 (наўмысныя дзеянні, накіраваныя на ўзбуджэнне іншай сацыяльнай варожасці або розні па прыкмеце іншай сацыяльнай прыналежнасці) і арт. 369 (абраза прадстаўніка ўлады і яго блізкіх у сувязі з выкананнем ім службовых абавязкаў, здзейсненая ў інфармацыі, размешчанай у глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт) КК.

«Падазраванымі па крымінальнай справе з'яўляюцца 136 так званых ананімных каментатараў. Да іх прыменена мера стрымання ў выглядзе змяшчэння пад варту. Праводзяцца следчыя дзеянні, накіраваныя ў тым ліку на ўстанаўленне ўсіх фактаў супрацьпраўнай дзейнасці кожнага фігуранта для дачы канчатковай прававой ацэнкі іх дзеянням і прад'яўлення абвінавачвання. Праваахоўнымі органамі працягваецца праца па ўстанаўленні такога роду злачынстваў і выяўленні асоб, да іх датычных. Вас папярэджвалі: усе, хто зрабіў хайп на горы сям'і афіцэра, будуць знойдзеныя», — рэзюмавалі ў СК.

# Не чакайце, пакуль шэрае стане белым

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

***— Наколькі сёння заробкі «ў канвертах» — распаўсюджаная з'ява?***

— Цяжка адказаць адназначна. Да таго ж у нас няма такой статыстыкі. Магу зыходзіць толькі з вопыту зносін з людзьмі, якія да нас звяртаюцца. Дык вось, тыя, хто цяпер афармляе пенсію, сутыкаюцца з такой праблемай, што за 90-я гады мінулага стагоддзя не могуць пацвердзіць памер заробку, бо ні на руках, ні ў архівах няма ніякіх дакументаў. Таму калі параўноўваць маштабы «шэрых» заробкаў тады і цяпер, то ў наш час іх, вядома, менш. Але за кожным фактам — чалавек, яго дабрабыт.

Цяпер заробак «у канверце» ў чыстым выглядзе сустракаецца радзей, больш распаўсюджаная камбінаваная форма, то-бок афіцыйна выплачваецца мінімальны, устаноўлены з 1 студзеня ў памеры 400 рублёў, астатняе — у так званым канверце.

***— Хто ўваходзіць у групу рызыкі па атрыманні такіх гібрыдных заробкаў?***

— У прынцыпе любы чалавек, які пагадзіўся на такія ўмовы. Адзначыў бы маладых людзей, якія хочуць добра зарабляць цяпер, а пра пенсію яшчэ не думаюць. Больш за ўсё рызыкуюць маладыя жанчыны. Нагадаю, што аплата дэкрэтнага водпуску, а ён доўжыцца 120—146 дзён, ажыццяўляецца са сродкаў нашага фонду, як і выплата дапамог па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў. Сума «дэкрэтных» разлічваецца зыходзячы з сярэдняга дзённага заробку за апошнія 6 месяцаў. Пагадзіцеся, што ёсць розніца: 17 рублёў на дзень пры мінімальнай зарплаце або 37 рублёў пры рэальнай зарплаце ў 900 рублёў. Памнажаем 17 на 120, атрымліваем 2040, а пры «белай», рэальнай, зарплаце сума склала б 4440 рублёў.

Рызыкуе любы чалавек, які працуе. Перш за ўсё, аплата бальнічнага, водпуску. А калі вытворчая траўма? У такіх выпадках на бальнічным можна правесці некалькі месяцаў, а то і інваліднасць атрымаць. І пры разліку пенсіі па інваліднасці таксама будзе ўлічвацца афіцыйны заробак. Калі наймальнік эканоміць на падатках, выплатах у ФСАН, то няўжо ён будзе добраахвотна даплачваць работніку са сваіх сродкаў у выпадку бальнічнага або доўгія гады дапамагаць чалавеку, які атрымаў траўму на вытворчасці?

Дадам, што калі заробак у чалавека на 100 % у канверце, то ён не можа разлічваць на атрыманне нават невялікага спажывецкага крэдыту, растэрміноўкі. Пры, так бы мовіць, камбінаванай зарплаце, зноў жа, банкам будзе ўлічвацца толькі афіцыйная сума.

***— Да каго звычайна звяртаюцца людзі, калі ўзнікла канфліктная сітуацыя з наймальнікам пры аплаце таго ж бальнічнага?***

— Да нас, у інспекцыю працы. Але мы можам дапамагчы грамадзяніну толькі ў рамках яго афіцыйнага заробку. Таксама па фактах выплаты зарплаты «ў канвертах» грамадзяне могуць звяртацца ў Камітэт дзяржаўнага кантролю.

***— Юрый Іванавіч, але кожны хоча жыць лепш ужо сёння. І калі чалавек аказваецца перад выбарам: афіцыйны заробак у 500 рублёў і мікс «белага» і «шэрага» ў 800, то відавочна, што ён абярэ.***

— Вось гэта і дрэнна. Такія прапановы захоўваюцца ў тым ліку і таму, што людзі на іх згаджаюцца. Кожны работнік пры прыёме на работу павінен атрымаць на рукі дагавор або кантракт, у якім выразна прапісаныя правы і абавязкі абодвух бакоў. І толькі тое, што напісана на паперы і змацавана подпісамі, будзе разглядацца ў любой інстанцыі. Таму заклікаю падумаць пра тое, што імгненная выгада рана ці позна ператворыцца ў праблемы і страты.

Не лішне нагадаць, што для наймальнікаў з чэрвеня гэтага года прадугледжана ўзмацненне адказнасці, аж да крымінальнай за выплату заробку «ў канверце». Што датычыцца работнікаў, то пры ўмове, што яны даюць паказанні як сведкі ў дачыненні да фактаў выплаты «шэрага» або «чорнага» заробку, з названых імі сум не будзе прад'яўляцца да выплаты падаходны падатак. Пры гэтым усе сацыяльныя гарантыі работнік могуць быць адноўленыя за перыяд атрымання няўлічаных грошай пры ўмове кампенсацыі наймальнікам нявыплачаных сум страхавых узносаў у бюджэт Фонду сацыяльнай абароны.

**Аксана ЯНОЎСКАЯ.**

Рэзананс

# БОЛЬШ ПЫТАННЯЎ, ЧЫМ АДКАЗАЎ

**Беларускі камітэт абароны журналістаў БСЖ выказвае салідарную з меркаваннем сакратарыята саюза пазіцыю наконт закрыцця «Комсомольской правды в Беларуси», паведамілі ў БСЖ.**

«На разгляд камітэта былі вынесены вытрымкі з запыту ад генеральнага дырэктара «БелКП-ПРЭС» (датаваны 05.10.2021) аб аднаўленні вяшчання электроннай версіі «КП в Беларуси» і выпраўленні рэдакцыяй парушэнняў дзеючага заканадаўства ў сферы СМІ. З'яўленне ў гэты ж дзень паведамлення аб прымусовым закрыцці рэдакцыі з боку расійскага медыяхолдынга ў сувязі з гэтым таксама выклікае шмат пытанняў, — адзначаецца ў заяве. — А менавіта: наколькі ўзгоднены дзеянні маскоўскай і мінскай рэдакцый? хто з кіраўнікоў КП прымае рашэнні аб рабоце выдання і яго рэдакцыйнай палітыцы? якія мэты ставяць гэтыя кіраўнікі ў складанай сітуацыі? наколькі абаронены беларускія журналісты — супрацоўнікі беларускага СМІ ад эмацыянальных рашэнняў у сферы працоўных правоў, этыкі і прафесійных адносін?.. І яшчэ шмат пытанняў. Камітэт працягвае ўважліва сачыць за развіццём сітуацыі. Члены камітэта маюць намер запытаць дадатковыя кансультацыі з кіраўніцтвам Саюза журналістаў Расіі і ў рамках інтэграцыйных журналісцкіх супольнасцяў Расіі і Беларусі».

Раней у Беларускім саюзе журналістаў заявілі, што з вялікай трывогай успрымаюць паведамленне аб закрыцці «Комсомольской правды в Беларуси». Там адзначылі, што гэтае рашэнне выклікае больш пытанняў, чым дае адказаў.

«Закрыццё беларускага сродку масавай інфармацыі з устойлівай аўдыторыяй і пэўнай пазіцыяй на беларускім медыяландшафце ставіць пад сумненне ранейшыя заявы з маскоўскага холдынга аб незалежнасці рэдакцыйнай палітыкі «КП в Беларуси». Якая пазіцыя выдавецкага дома сёння? У журналісцкай супольнасці Беларусі цыркулюе інфармацыя, што гэта эмацыянальнае рашэнне магло быць прынята з-за «някіруемай сітуацыі ўнутры беларускага калектыву аўтараў». Нібыта прыезд спецпрадстаўніка ВД «Камсамольская праўда» В. Алфімава ў Мінск пацвердзіў гэты стан спраў і справакаваў такое радыкальнае рашэнне. Ці так гэта? Ці можна было вырашыць унутраны канфлікт у рэдакцыі на падставе этычнага стандарту і кропкавымі кіраўніцкімі рашэннямі?» — падкрэслілі ў БСЖ.

— Тут трэба падзяляць два гэтыя прэцэдэнты, следства ў дачыненні да журналіста, які падрыхтаваў матэрыял, што, на думку праваахоўных органаў, распальваюць нянавісць, і дзеянні Мінфарма ў дачыненні да выдання «Комсомольская правда в Беларуси», — заўважыў у эфіры тэлеканала АНТ дырэктар інфармацыйна-аналітычнага цэнтра «Актуальная канцэпцыя» Аляксандр Шпакоўскі. — Усё гэта можна было адпаведным чынам урэгуляваць у перагаворах з Міністэрствам інфармацыі, аспрэчыць у судзе і гэтак далей. Уласнікі выдання пайшлі па іншым шляху, мы не можам дыктаваць ім свае ўмовы. Адначасова, вядома, непрыемна і крыўдна за беларускіх чытачоў дадзенага рэсурсу, ну што ж? Мабыць, так яны ставяцца да сваёй аўдыторыі».

**Пётр ДУНЬКО.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Страты сусветнага ВУП могуць вырасці да $5,3 трлн




Гэта адбудзецца на працягу наступных пяці гадоў, калі не атрымаецца вакцынаваць ад каранавіруса большую частку насельніцтва планеты. Аб гэтым заявіла дырэктар — распарадчык Міжнароднага валютнага фонду (МВФ) Крысталіна Георгіева, паведаміла ТАСС. Паводле яе слоў, каб не дапусціць такога развіцця падзей, трэба рэзка павялічыць дастаўку доз вакцыны ад ковіду ў краіны, якія развіваюцца. «Больш багатыя краіны павінны неадкладна выканаць свае абавязацельствы па бязвыплатнай перадачы прэпаратаў. І разам мы павінны павялічыць аб'ёмы вытворчасці і распаўсюджвання вакцын, зняць гандлёвыя абмежаванні на медыцынскія матэрыялы», — растлумачыла кіраўнік арганізацыі. Таксама Крысталіна Георгіева заявіла, што МВФ чакае сёлета невялікае зніжэнне тэмпаў росту сусветнай эканомікі, дадаўшы, што свет «сутыкаецца з глабальным аднаўленнем эканомікі, якое па-ранейшаму затармажана пандэміяй і яе наступствамі». Яна адзначыла, што агульны суверэнны дзяржаўны доўг усіх краін вырас амаль да 100 % сусветнага ВУП.

## У некалькіх раёнах Італіі з-за навальніц абвешчаны чырвоны ўзровень небяспекі

Найвышэйшы, чырвоны ўзровень кліматычнай небяспекі аб'яўлены з-за дажджоў у шэрагу раёнаў трох паўночных абласцей Італіі — Лігурыі, Ламбардыі і П'емонта. Аб гэтым паведаміла РІА «Навіны» са спасылкай на тэлеканал RaiNews24. Моцныя ліўні з навальніцамі і парывістым ветрам абрынуліся на Італію ў пачатку тыдня. У пранядзелак у некалькіх гарадах выпала рэкордная колькасць ападкаў, у выніку чаго рэкі выйшлі з берагоў. На думку спецыялістаў, сітуацыя ў паўночных абласцях краіны павінна нармалізавацца, аднак надвор'е ў найбліжэйшы час усё ж застанецца няўстойлівае.



## Малюнкі раней невядомай старажытнай цывілізацыі выявілі ў Тыбеце



Удзельнікі Цынхай-Тыбецкай навуковай экспедыцыі выявілі малюнкі на скалах каля возера Намца ў Тыбеце, паведамляе тэлеканал CGTN. Спецыялісты мяркуюць, што гэтыя выявы, а таксама знойдзеныя непадалёку грабніцы і інструменты з каменю, могуць сведчыць аб знаходжанні некалі ў гэтых мясцінах дагістарычнай качавой цывілізацыі. Экспедыцыі з мэтай даследавання малюнкаў у ваколіцах возера Намца праводзяцца з 2017 года. Гэтым разам навукоўцам удалося знайсці цэлы кластэр петрогліфаў. Вывучэнне гэтых малюнкаў ужо дазволіла зрабіць выснову, што качавыя плямёны Цынхай-Тыбецкага плато актыўна кантактавалі з іншымі этнічнымі групамі рэгіёна.

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні родным і блізкім заслужанага работніка сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь, старшыні Бялыніцкага сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва «Калгас «Радзіма» Аляксандра Міхайлавіча ЛАПАЦЕНТАВА ў сувязі з яго смерцю.**

# ВАРШАЎСКІЯ ДЭМАНЫ

## Што адбываецца ў Польшчы?

**Сейм Польшчы зацвердзіў рашэнне ўрада аб прадаўжэнні рэжыму надзвычайнага становішча на граніцы з Беларуссю яшчэ на 60 дзён, паведаміла радыё RMF24. Адметна, што падчас галасавання меркаванні парламентарыяў падзяліліся амаль пароўну: за зацвярджэнне гэтага рашэння выступілі 237 дэпутатаў, супраць — 179, устрымаўся 31. Як нагадала «Польскае радыё», раней надзвычайнае становішча на польскай граніцы было абвешчана на 30 дзён з 3 верасня ў 183 населеных пунктах у Падляскім і Люблінскім ваяводствах. Пры гэтым эксперты сцвярджаюць, што ўвядзенне надзвычайнага рэжыму адбылося зусім не з-за міграцыйнага крызісу, які ахапіў краіну. Бежанцы сталі для палітычнага істэблішменту толькі спрыяльным фонам. Што ж насамрэч адбываецца ў Польшчы?**



### ПАРТЫЙНАЯ АПЕРАЦЫЯ

Увядзенне рэжыму надзвычайнага становішча, прычым упершыню ў найноўшай гісторыі Польшчы, — справа насамрэч экстраардынарная, і падставы павінны быць вельмі важкія. Аднак тут не ўсё так адназначна. Эксперты гавораць аб маніпуляцыях. Тлумачыць гэтую «анамалію» палітолаг з варшаўскага Універсітэта Стэфана Вышынскага Антоній Дудэк проста. «Я сказаў бы, што [увядзенне надзвычайнага становішча] — на 90 % партыйная аперацыя, — заўважыў эксперт «Бі-бі-сі». — За апошнія трыццаць гадоў у нас былі і больш драматычныя падзеі, але надзвычайнага становішча ніколі не ўводзілі».

Крытыкі ўлады сцвярджаюць, што сапраўдных прычын, якія могуць падахвочваць афіцыйную Варшаву да такіх неардынарных крокаў, на самай справе дзве. Першая з іх — імкненне зачысціць медыяпрастору ад матэрыялаў пра тое, што ўлада не можа справіцца з міграцыйным крызісам на граніцы. «Для мяне відавочна: гаворка ідзе аб стварэнні перашкод для журналістаў, для грамадскасці ў тым, каб атрымліваць інфармацыю пра падзеі на граніцы. Калі гэта будзе паласа шырынёй у тры кіламетры, то з такой адлегласці ніхто не разгледзіць, што на граніцы адбываецца, як абыходзяцца з бежанцамі», — заявіў у эфіры тэлеканала TVN24 суддзя Канстытуцыйнага суда Польшчы ў адстаўцы Войцэх Хермелінскі.

Ужо на наступны дзень пасля падпісання прэзідэнтам Польшчы Анджэем Дудам у пачатку верасня распараджэння аб увядзенні рэжыму надзвычайнага становішча пагранічнікі затрымалі журналіста выдання Onet Бартламея Бублевіча. Яму прад'явілі абвінавачванні ў знаходжанні на тэрыторыі, на якой дзейнічае рэжым надзвычайнага здарэння, без дазволу і ў «фіксацыі пагранічнай інфраструктуры пры дапамозе тэхнічных сродкаў». Затое цяпер, адзначыў з парламенцкай трыбуны член апазіцыйнай фракцыі «Левіца» Мацэй Гдуля,



сітуацыю на польска-беларускай граніцы асвятляюць выключна беларускія журналісты, і гэта наўрад ці той вынік, якога хацела дасягнуць сваімі дзеяннямі ўлада.

Нарэшце, называе палітолаг Антоній Дудэк другую непублічную прычыну ўвядзення рэжыму надзвычайнага становішча — праблемы кіруючай партыі «Права і справядлівасць» з папулярнасцю. Згодна з вынікамі сацапытанняў, у ліпені рэйтынг партыі ўлады апусціўся ў параўнанні з папярэднімі замерамі. «Апошнім часам у «Права і справядлівасці» была «сацыялагічная дыхавіца». У міграцыйным крызісе яна ўбачыла шанц пераламу і вырашыла трохі падцяпліць атмасферу. Несумненна, надзвычайнае становішча атмасферу падцепліць, пытанне толькі — ці не перагрэе», — заўважыў Антоній Дудэк.

### РОГАТ У СЕЙМЕ

Адметна, што Анджэй Дуда, які падпісаў распараджэнне аб першым у найноўшай гісторыі Польшчы рэжыме надзвычайнага становішча, сам на разгляд гэтага пытання ў сейме не прыйшоў. «Спадар прэзідэнт!» — пачыналі адразу некалькі апазіцыянераў свае прамовы з парламенцкай трыбуны пад рогат сваіх калег. Смех быў выкліканы тым, што, нягледзячы на беспрэцэдэнтны ўзровень пагрозы, якой усіх палохалі прадстаўнікі ўлады, на пасяджэнне сейма Анджэй Дуда проста не прыйшоў.

Апазіцыянеры нагадвалі, што яшчэ два тыдні таму ўрад сцвярджаў, што ўсходняя граніца краіны знаходзіцца на замку і што патрэбы звяртацца па дапамогу да пагранслужбы ЕС, якая, дарэчы, базіруецца ў Варшаве, няма. Дэпутаты справядліва падкрэслівалі, што літаральна ў мінулым годзе ўлада «не пачула» патрабавання ўвесці надзвычайнае становішча з-за разгортвання эпідэміі каранавіруса. Яна не пайшла на гэта, як лічыцца, з-за імкнення ў што б там ні стала правесці прэзідэнцкія выбары ў выгадны для сябе момант. Дэпутаты таксама заўважылі, што рашэнне аб увядзенні рэжыму надзвычайнага становішча было прынята без кансультацыі хоць бы ў рамках Савета нацыянальнай бяспекі краіны.

Некаторыя аналітыкі лічаць, што праз увядзенне рэжыму надзвычайнага становішча ўлада пераследуе больш аддаленыя па часе мэты, чым проста накручванне сабе зніжанага рэйтынгу. «Гэта праверка інструмента, які можна будзе выкарыстаць праз два гады [у 2023-м у Польшчы павінны адбыцца парламенцкія выбары. — **Рэд.**], калі «Праву і справядлівасці» будзе пагражаць страта ўлады», — абвясціў напярэдадні галасавання член апазіцыйнай «Левіцы» Анджэй Шэйна. А падчас парламенцкай дыскусіі яго калега па партыі Каміла Гасюк-Піховіч заявіла: «Калі мы дазволім вам увесці надзвычайнае становішча цяпер, то наступнае вы ўведзяце проста калі захочаце!» Зрэшты, апеляцыі апазіцыянераў так і засталіся непачутымі.

### БЕСКАНТРОЛЬНЫ ГВАЛТ

Польшча парушае свае абавязацельствы па прыёме бежанцаў. Пра гэта ў эфіры «Альфа Радыё» заявіў палітолаг Аляксей Дзермант, каментуючы рашэнне ўрада Польшчы аб увядзенні рэжыму надзвычайнага становішча. Эксперт адзначыў, што гэта, з аднаго боку, спосаб не даць СМІ асвятляць тое, што адбываецца, а з другога — фактычна дазвол вычвараць усё, што заўгодна. Ён дадаў, што пад эгідай надзвычайнага становішча можна бескантрольна прымяняць гвалт.

«Трэба разумець, навошта гэта робіцца. Не толькі каб спыніць паток бежанцаў. Унутры Польшчы пачынаецца адметны рух сярод СМІ, апазіцыйных партый і палітыкаў. Яны імкнуцца трапіць на граніцу, удакладніць сітуацыю і зрабіць нейкія рэпартажы. Гэта вельмі нявыгадна для польскіх улад. Мы бачым, што паднялася хваля ў СМІ, у тым ліку ў еўрапейскіх. Прыязджаюць чыноўнікі, каб паглядзець, што адбываецца на граніцы. Усё ж такі Польшча парушае свае абавязацельствы па прыёме бежанцаў. Паспрабаваць прыпыніць медыйнае асвятленне, можа быць, і атрымаецца, але спыніць паток мігрантаў — наўрад ці», — лічыць Аляксей Дзермант.

Эксперт таксама распавёў, што на тэрыторыі Германіі і Францыі ўжо сталі выяўляць людзей, якія трапляюць туды паўночным маршрутам з Польшчы ў Літву. На яго думку, ужо існуе нейкі механізм нелегальнай перапраўкі. «Трэба разумець, што перапраўка людзей праз мяжу — гэта вельмі сур'ёзны бізнес. Перапраўка чалавека з Ірака ў Германію каштуе $10 тысяч. Таму трэба ўлічваць, што бежанцы разлічваюць на тое, што ўжо ўнутры дзяржавы ёсць людзі, якія гэтым прафесійна займаюцца, у тым ліку ў саміх праваахоўных структурах», — падкрэсліў аналітык.

Пасля высветлілася, што на тэрыторыі Польшчы дзейнічае сетка арганізатараў незаконнай міграцыі. Пра гэта паведамілі ў Дзяржпагранкамітэце. «Польшча не хавае, што менавіта з яе тэрыторыі аказваецца садзейнічанне нелегальнай міграцыі. Паводле афіцыйнай статыстыкі, якая амаль штодня публікуецца Пагранічнай вартай у «Твітэры», толькі за апошні месяц на польскай тэрыторыі затрымана амаль 100 памагатых, якія аказвалі садзейнічанне ў перасячэнні польскай граніцы, а таксама забяспечвалі прытрымліванне бежанцаў у краіны ЕС. Акрамя таго, незаконнае выцясненне замежнікаў у Беларусь забяспечваюць і прадстаўнікі Пагранічнай варты. Карыстаючыся службовым становішчам і ўвядзеннем надзвычайнага становішча ў прыгранічных раёнах, польскія сілавікі падымаюць платы, гвалтоўна выцясняюць і проста выкідваюць людзей без прытомнасці на беларускую тэрыторыю», — распавялі ў ДПК. У ведамстве адзначылі, што ў мэтах утойвання сваіх незаконных дзеянняў яна не дапускае на лінію граніцы ні журналістаў, ні праваабаронцаў, ні нават прадстаўнікоў еўрапейскага пагранічнага агенцтва Frontex.

### У ЖУДАСНЫХ УМОВАХ

«Рашэнне ўрада ізаляваць тэрыторыю — гэта скандал», — заўважыў Deutsche Welle дэпутат сейма Францішак Старжэўскі. Ён быў на граніцы і на свае вочы пераканаўся ў тым, што там адбываецца. Старжэўскі кажа, што гаворка не ідзе пра тое, каб прапусціць праз граніцу кожнага, а аб магчымасці для бежанцаў падаць прашэнне і легальна апынуцца ў ЕС. «Урад хоча з дапамогай рэжыму надзвычайнага становішча толькі схаваць, як бесчалавечна абыходзяцца з бежанцамі на граніцы», — кажа дэпутат. А яшчэ ўлады, паводле яго слоў, хочуць, каб журналісты не маглі пісаць крытычныя артыкулы на гэтую тэму.

У Польшчы прайшлі пратэсты супраць дзеянняў улад — у знак салідарнасці з мігрантамі. Адметна, што на гэтым баку актыўна выступілі і польскія біскупы, якія падтрымалі просьбу Папы Рымскага паклапаціцца аб афганскіх бежанцах. Тым часам б'юць трывогу і міжнародныя арганізацыі. У ААН вельмі занепакоеныя станам мігрантаў, якія аказваюцца без сродкаў да існавання ў прыгранічных зонах. У арганізацыі лічаць, што, пакідаючы мігрантаў на волю лёсу, краіны парушаюць свае міжнародныя абавязацельствы. Як заявіў iz.ru прадстаўнік упраўлення вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў (УВКБ ААН) у Польшчы Крысцін Гое, у людзей у надзеі на прытулак заўсёды павінна быць магчымасць звярнуцца па міжнародную абарону.

Міжнародныя праваабаронцы вінавацяць Польшчу ў прымусе мігрантаў пераходзіць на беларускі бок граніцы дзвюх краін, што з'яўляецца парушэннем еўрапейскага заканадаўства ў галіне міграцыі. Amnesty International прадставіла сведчанні таго, што ў Беларусь былі выцеснены па меншай меры 32 мігранты. «Гэтая сітуацыя створана самой Польшчай, — цытуе Euronews дырэктара Amnesty International EU Еву Гедзі. — Людзей затрымалі ў памежнай зоне. Многія ўсё яшчэ знаходзяцца там у жудасных умовах. Так што будзе толькі горш. Цяпер неабходна, каб польскія ўлады ўсталявалі кантакт з гэтымі людзьмі і забяспечылі бесстаронні разгляд кожнай просьбы аб выдзяленні прытулку, як гэта вызначана міжнародным правам. А Еўрасаюз павінен дзейнічаць хутка і рашуча ў дачыненні да гэтага супрацьстаяння».

«Дэманы гісторыі прачынаюцца на нашых вачах, і кожны дзень мы павінны супрацьстаяць ім», — напісаў у сваім артыкуле ў Postimees прэм'ер-міністр Польшчы Матэўш Маравецкі. «Падобныя высновы маглі б зацікавіць псіхааналітыка», — іранізуе з гэтай нагоды russtrat.ru. Напэўна, у прымяненні да цяперашняй сітуацыі каментарыі тут залішнія.

**Пётр ДУНЬКО.**

Тым часам

## МЗС БЕЛАРУСІ ПРАПАНАВАЛА ПОЛЬШЧЫ АДДАЦЬ СВАЮ ГУМДАПАМОГУ ЛІТВЕ ЦІ «ВЯДОМЫМ БЕЛАРУСКІМ ЭКСТРЭМІСТАМ»

У Міністэрстве замежных спраў Беларусі адказалі на пытанне журналістаў, ці будзе Беларусь прымаць анансаваную намеснікам міністра замежных спраў Польшчы Марцінам Пшыдачам гуманітарную дапамогу для мігрантаў.

«Такія заявы — гэта не больш чым палітыканства і папулісцкая рыторыка, якая не мае нічога агульнага з аб'ектыўнай рэальнасцю і сапраўдным станам рэчаў. Больш за тое, у чарговых паспешных аднабаковых рашэннях Польшчы нешта некуды накіраваць без усякага сэнсу, запыту або хоць бы згоды партнёра відавочна праглядвае пэўная пагарда да беларускай дзяржаўнасці і суверэнітэту. Таму тым больш сумна такое чуць ад высокапастаўленага прадстаўніка МЗС суседняй краіны», — заявіў прэс-сакратар МЗС Анатоль ГЛАЗ.

«А гіпатэтычная дапамога, якую, падкрэслю, з нашага боку ніхто не прасіў і ў якой няма ніякай аб'ектыўнай неабходнасці, упэўненыя, можа быць пры жаданні выкарыстаная польскім бокам сапраўды па прызначэнні. Яны маюць права прапанаваць яе, напрыклад, суседняй Літве, нечалавечыя ўмовы ўтрымання бежанцаў у якой ужо вядомыя ўсяму свету, непасрэдна перадаць яе афганскім бежанцам, што ўжо які месяц знаходзяцца на польскай граніцы і якім пастаянна аказваюць дапамогу беларускія грамадзяне і грамадскія арганізацыі. Ну, або ў крайнім выпадку ў якасці дапаўнення могуць аддаць яе вядомым беларускім экстрэмістам, якіх хавае польскі бок», — сказаў афіцыйны прадстаўнік беларускага МЗС.

Анатоль Глаз назваў абсурднымі і смешнымі заявы аб нейкай гатоўнасці дапамагаць «людзям, якія апынуліся ў складанай сітуацыі» ад прадстаўніка краіны, дзе бежанцаў збіваюць да паўсмерці, незаконна выціскаюць і не шкадуюць нават дзяцей-інвалідаў, уводзіцца надзвычайнае становішча, каб гэта схаваць. І якая не проста ігнаруе рашэнні большасці міжнародных арганізацый і палажэнні адпаведных дакументаў, але і абуральным чынам прама адмаўляецца выконваць патрабаванні Еўрапейскага суда па правах чалавека якраз аб дапамозе бежанцам, што заселі на граніцы. «Балазе, што грамадства ўсё гэта выдатна разумее і бачыць», — заўважыў прэс-сакратар МЗС.

# СОРАМ НА ПЯЦЬ ІКСОЎ,

## або Выратаванне — толькі ў самаіроніі

*Начытаўшыся кніг па выхаванні дзяцей, з трывогай чакала наступлення пераходнага ўзросту ў сваіх. Старэйшай дачцэ — сямнаццаць. Зыходзячы з уласнага невялікага досведу зразумела, што, у прынцыпе, побач з падлеткам выжыць можна. Галоўнае, сачыць за тым, што гаворыш. А тут ужо як пашанцуе: сёння твае словы выклікалі буру смеху, а заўтра нешта падобнае справакуе ў падлетка абурэнне і прывядзе да грандыёзнага скандалу. Цяпер і сын Мішка зведаў гэты дзіўны падлеткавы стан. Я па-ранейшаму стараюся падтрымліваць з ім цёплыя і даверлівыя адносіны, але гэта ўсё роўна не выключае непаразуменняў і крыўды. Асабліва яго стала раздражняць маё «дзяўбенне» наконт яго абавязкаў, спраў, гурткоў і іншага. Таму я прыдумляю разнастайныя спосабы пазбегнуць гэтай сваёй бацькоўскай функцыі або, калі вельмі трэба, раблю тое неяк апасродкавана. Так было і тады, калі прыйшоў час басейна. Знарок пачала гучна нагадваць дзесяцігадовай дачцэ, што трэба браць з сабой на плаванне. Потым ненадакучліва спытала ў сына, ці ёсць у яго ўсё неабходнае для паходу на гурток. Сын знік у сваім пакоі і ўжо адтуль выгукнуў, што ўсё «норма».*

*Я адразу зразумела, што нешта не так, калі ён зайшоў у кватэру, не разуваючыся, пакрочыў да мяне ў пакой і сеў побач з гучным уздыхам.*

*— Мам, гэта такі жах... Сорам на тры іксы!*

*Я напружылася: калі справа датычыцца сораму і бясслаўя падлетка, трэба быць вельмі ўважлівымі, каб гэты «сорам» зрабіць не такім ужо страшным — у дадатак падтрымаць і суцешыць.*

*— Прыходжу ў басейн, а там на мой час дзве групы працуюць: для дарослых і падлеткаў, якія ўмеюць плаваць, і другая група — для дзяцей і падлеткаў, якія толькі вучацца. Я выдатна ўмею плаваць, тым больш не першы год займаюся, таму пайшоў у першую. Калі ўсе сабраліся, трэнер папрасіў здаць меддаведку і абанемент. А я... Я не ўзяў.*

*— Міш, ну такое бывае, любы можа забыцца...*

*— Мам, ну не на першы ж занятак! Яны ж мяне ніколі не бачылі! Я ім спрабаваў даказаць, што ты купіла абанемент, нават прапанаваў патэлефанаваць табе. Яны параіліся і вырашылі ўсё ж пусціць мяне. Кажуць, абувай пантофлі і ідзі ў раздзявальню...*

*— І?*

*— Мам, я пантофлі забыўся! Вахцёркі сталі вохкаць: як жа так, а што рабіць? Усе глядзяць на мяне. Гэта быў такі сорам. Сталі шукаць у пакінутых рэчах чужыя. Ружовыя, па памеры, не стаў абуваць, узяў нейкія гіганцкія і, як Маленькі Мук, паплёўся за ўсімі ў душ.*

*— Ну, бывае... Але ж усё добра скончылася: у басейн пусцілі, пантофлі знайшлі.*

*— Мам, у раздзявальні я зразумеў, што не ўзяў гумовую шапачку...*

*— Мішка! — усклікнула я, ледзь стрымліваючы смех. — Што ж ты тады ўзяў?*

*— Рушнік і плаўкі... Зрэшты, шапачку таксама трэнер даў, але падазрона спытаў, ці ўмею я плаваць. Ну, думаю, зараз я ўмомант аднаўлю сваю рэпутацыю «нармальнага». Скокнуў у ваду і... з жахам усведамляю, што я быццам бы рухаю рукамі і нагамі, але... не плыву! Гэта было больш падобна на бессэнсоўнае боўтанне...*

*Я набрала ў лёгкія пабольш паветра і моцна сціснула вусны. Сябе нельга было выдаць, бо мой смех мог закрануць самалюбства гэтага «цудоўнага птушаняці».*

*— Трэнер глядзеў, глядзеў, а потым кажа: мабыць над тэхнікай яшчэ трэба будзе папрацаваць...*

*— Ён зразумеў, што ты пасля доўгага перапынку, усім патрэбны час, каб асвоіцца.*

*— Магчыма... Але, ведаеш, мы апошняя група і нам дазваляюць плаваць даўжэй за ўсіх. Нашы ўсе ўжо павылазілі, засталіся толькі самыя ўстойлівыя. Я і яшчэ два хлапчукі. Думаю, вылезу самы апошні. Пакажу, які я... І тут трэнер падыходзіць да мяне і кажа: Міш, можа, табе холадна, вылазь ужо. Я, вядома, адмовіўся. Хоць разумеў, што ўжо злёгку змерз. Але праз пяць хвілін трэнер зноў падыходзіць і кажа, што яго турбуе колер маіх вуснаў, лепш вылазіць. Іду ў раздзявальню, гляджу ў люстэрка, а там сіні-сіні хлопчык, нейкі худы, дрыжыць, і шлёпанцы гэтыя гіганцкія...*

*Гэта было апошняй кропляй. Я зарагатала. Не магла ніяк супакоіцца.*

*— Прабач, сынок, але гэты «сорам» не на тры іксы, а на цэлых пяць...*

*Мішка засмяяўся. Вядома, потым была размова пра тое, што такі «сорам» часам здараецца ў жыцці і таму нядрэнна б ставіцца да падобнага вопыту з самаіроніяй. Казалі і пра тое, што можна зрабіць, каб пазбегнуць такіх канфузаў, аб тайм-менеджменце, напамінах у тэлефоне, уважлівасці... У выніку бацьку сын расказваў ужо смешную гісторыю пра «сорам» на пяць іксоў.*

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**


Сямейная газета

Выпуск № 18 (177)


Тыя, хто побач

**Валерый КАЛАДЗІНСКІ:**

# «У ВАНЕСЫ З ДЗЯЦІНСТВА ХАРАКТАР ПЕРАМОЖЦЫ»



Фота з асабістага архіва героя.

**НА Алімпійскіх гульнях у Токіа бронзавы медаль у жаночай барацьбе заваявала Ванеса Каладзінская. Да гэтай узнагароды яна ішла доўга і ўпарта, праз траўмы, хваробы, рэабілітацыю пасля родаў. Спартыўны характар і імкненне быць найлепшай у сваёй справе ў Ванесы закладзеныя на генетычным узроўні. Яе бацька Валерый Каладзінскі — галоўны трэнер зборнай Беларусі па спартыўнай гімнастыцы. Ён жартуе, што іншага выбару, акрамя спорту, у Ванесы не было. І менавіта ён ведае яе як ніхто іншы. Пра тое, як выхаваць паспяховую спартсменку і моцную асобу, Валерый Каладзінскі расказаў «Звяздзе».**


***(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)***


У полі зроку

# ГАЛОЎНАЯ МІСІЯ — ДАПАМАГАЦЬ

## Прызнанне сям'і сацыяльна небяспечнай для дзяцей — не прыгавор

**...Калі Таццяна ўсвядоміла, што аднойчы яна можа вярнуцца дадому, а дзяцей адбяруць, то спачатку спалохалася. Потым ужо стала злавацца. Чаму сям'ю прызналі сацыяльна небяспечнай? Усё ж добра: дзеці не галадаюць, адзенне ёсць, муж працуе... Чамусьці нехта вырашыў, што ў яе ёсць праблема з алкагольнай залежнасцю. Але справа ў тым, што ніякай залежнасці няма! Таццяна піла «як усе», па выхадных, часам, праўда, пасядзелкі з сябрамі зацягваліся, але гэта не значыць, што яна нейкая «алкашка»...**

З такімі думкамі жанчына ішла на прыём да псіхолага ў Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнай абароны насельніцтва Маскоўскага раёна Мінска. Тады яна яшчэ не ведала, што там будзе пакладзены пачатак новага жыцця, якое дапаможа наладзіць адносіны з дзецьмі і мужам.

— Словазлучэнне «сопаўская сям'я» ўжо трывала ўвайшло ў наша жыццё. Прычым многія ўпэўнены, што, калі дзяцей прызнаюць тымі, хто знаходзіцца ў сацыяльна небяспечным становішчы (СНС), гэта кляймо на ўсё жыццё, — тлумачыць **псіхолаг аддзялення сацыяльнай адаптацыі і рэабілітацыі Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнай абароны насельніцтва Маскоўскага раёна Мінска Паліна АБАКУМАВА.** — На самай справе гэта не так. Для нас СНС — гэта проста прыкмета крызісу ў сям'і, і наша задача — дапамагчы пераадолець гэты крызіс.

Звычайна сем'і, якія трапілі ў сацыяльна небяспечнае становішча, не могуць адразу ўсвядоміць, што ў іх ёсць праблема. Псіхолагі працуюць індывідуальна, каб чалавек на кансультацыі змог сам сфарміраваць запыт на дапамогу, то-бок вызначаецца праблема, далей — пошукі варыянтаў яе рашэння і, вядома, неабходных рэсурсаў. А выйсце знаходзіцца ў залежнасці ад таго, з якой прычыны дзеці аказаліся ў СНС. Прычыны бываюць у асноўным тры. Першая — бацькамі не задавальняюцца асноўныя жыццёвыя патрэбы дзіцяці. Іншымі словамі, калі сям'я незабяспечаная настолькі, што не можа, напрыклад, набыць неабходнае адзенне, гігіенічныя прылады, не ў стане даць патрэбу ў харчаванні... Такая сям'я можа трапіць на ўлік. У тэрытарыяльным цэнтры ў такіх сітуацыях кансультуюць, дзе і як можна атрымаць экстранную дапамогу, абавязкова аказваюць псіхалагічную падтрымку, калі чалавек страціў працу ці проста эмацыянальна выгарэў.



**Дырэктар тэрытарыяльнага Цэнтра сацыяльнай абароны насельніцтва Маскоўскага раёна Вольга КАТАВА.**


***(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)***

Нашы дзеці

# У СВАІМ СВЕЦЕ

## Расстройствы аўтыстычнага спектра: што гэта такое?

**Дзяцей з аўтызмам у апошнія дзесяцігоддзі стала больш. З чым гэта дакладна звязана, вучоныя пакуль не высветлілі. Але ўрачы падкрэсліваюць, што аўтызм і ўсе яго разнавіднасці, якія адносяцца да расстройстваў аўтыстычнага спектра, — не прыгавор. Так, такім дзецям цяжка наладзіць кантакт з навакольнымі. У іх ёсць свае інтарэсы, але гэта закрыты для навакольных свет, куды яны нікога не пускаюць. Аднак пры належнай карэкцыі дзеці абсалютна нармальна ўпісваюцца ў звыклае для нас жыццё — атрымліваюць адукацыю, асвойваюць прафесію, заводзяць сям'ю. Пра тое, як выхаваць асаблівае дзіця, мы паразмаўлялі з псіхолагам Мінскага клінічнага цэнтра дзіцячай псіхіятрыі і псіхатэрапіі Аленай САРОКІНАЙ.**



www.nuspit.ru

***— Алена Сяргееўна, што такое аўтызм?***

— Аўтызм — першазіўнае расстройства, інакш кажучы, яно ахоплівае ўсе сферы псіхічнага развіцця чалавека. І характарызуецца трыма групамі парушэнняў паводле МКБ-10 (класіфікацыі хвароб, якая выкарыстоўваецца ў краінах СНД). Гэта расстройства камунікацыі, расстройства ўзаемадзеяння і наяўнасць стэрэатыпных інтарэсаў і рухаў, якія паўтараюцца. Аўтызм — не захворванне, гэта расстройства або стан, які суправаджае чалавека на працягу ўсяго жыцця. І няма лекаў, якія зрабілі б яго здаровым. Таксама, на жаль, няма ніякага аналізу, які можа пацвердзіць ці абвергнуць наяўнасць у чалавека расстройстваў у спектры аўтызму ці дыягназ «дзіцячы аўтызм».

***— Самі бацькі могуць заўважыць дадзенае расстройства? Як яно праяўляецца ў малога?***

— Існуе набор «чырвоных флажкоў» аўтызму. Гэта паводзінскія праявы, якія бацькі могуць заўважыць і звярнуцца да спецыяліста. Іх можа быць вялікая колькасць, і яны адрозніваюцца, бо людзі з аўтызмам не падобныя адзін да аднаго. Але асноўныя сімптомы — адсутнасць зрокавага кантакту і рэагавання на звернутую да малога размову бацькоў, аж да таго, што на пэўным узроставым этапе дзіця можа не пазнаваць сваіх блізкіх. Таксама гэта стэрэатыпныя інтарэсы, якія паўтараюцца. Як правіла, дзіця цікавіцца толькі пэўнымі прадметамі ці групай прадметаў. Прычым у кожнага яны розныя: маленькія лялькі, бытавыя прыборы, брашуры. З боку такія інтарэсы заўсёды будуць выглядаць дзіўна. Калі гэта пэўныя маленькія лялькі, то малое будзе выстаўляць іх радкамі, не даючы даросламу ўмяшацца ва ўласную гульню. Такое дзіця пастаянна захопленае адным відам дзейнасці, скажам, раскручваннем колцаў у машынцы.

Таксама гэта спецыфічныя паводзіны ва ўласнай гульні, напрыклад, калі дзіця гуляе толькі лежачы, а калі вы імкняцеся пасадзіць яго на канапу ці перавесці ў іншы пакой, яно заўсёды будзе вяртацца ў пэўную позу і паўтараць пэўныя дзеянні. З боку гэта заўсёды выглядае дзіўна. Хутчэй за ўсё, бацькі ніколі раней не бачылі такіх паводзін у іншых дзяцей. Такія малыя вылучаюцца і на гульнявой пляцоўцы. Яны не імкнуцца ўстанавіць кантакт, не імітуюць дзеянні іншых дзяцей, не ўцягваюцца ў гульню з імі. Адсутнасць імітацыі — таксама «чырвоны флажок» аўтызму. Калі маці траціць шмат часу на тое, каб чаму-небудзь навучыць дзіця, а яно гэтаму ніяк не навучаецца, то гэта таксама знак.

> **«Аўтызм — гэта не прыгавор, такія людзі могуць функцыянаваць самастойна. Атрымліваць адукацыю, прафесію, ствараць сям'ю. І ў большасці выпадкаў усё можа быць вельмі пазітыўна».**

Спецыфічнымі інтарэсамі могуць быць літары. Такія дзеці вельмі хутка пачынаюць чытаць, пры тым што могуць не размаўляць. Бацькам гэта здаецца такім класным навыкам, што астатнія праблемы застаюцца за кадрам. І толькі калі час падыходзіць да школы, яны разумеюць, што дзіця не можа камунікаваць належным чынам, нягледзячы на свае таленты. Такія дзеці не дапускаць дарослага ва ўласную дзейнасць. Малое можа чытаць кнігу, але калі мама яе забірае, яно бурна рэагуе: пачынае плакаць, уцякаць, закрывацца. Калі пакінуць яго з гэтай кнігай, то працягне чытаць. Важна, каб бацькі своечасова заўважылі гэту асаблівасць і звярталіся да спецыяліста. Няхай лепш у тры гады скажуць, што ўсё нармальна і ніякіх асаблівасцяў з камунікацыяй у дзіцяці няма, чым цягнуць да школьнага ўзросту.

Адзін з галоўных маркёраў — маўленне. Часта такія дзеці не размаўляюць. Адбываецца гэта не таму, што яны не могуць. У іх парушана матывацыя да камунікацыі, і яны не могуць узаемадзейнічаць на належным узроўні.

***— У якім узросце ставіцца дыягназ?***

— Раней лічылася, што дыягназ можна паставіць толькі пасля трох гадоў, цяпер дыягностыка, у тым ліку і ў нашай краіне, пайшла на шмат крокаў наперад, можна казаць пра наяўнасць сімптомаў у спектры аўтызму ці рызыкі развіцця гэтага стану пачынаючы прыкладна з 1,5 года.

***— Куды звяртацца бацькам, калі яны заўважылі такія праявы?***

— Калі яны звярнулі ўвагу на змену ў паводзінах дзіцяці да трох гадоў, то варта звяртацца ў цэнтр ранняга ўмяшання. Гэта робіцца як праз неўролага ў дзіцячай паліклініцы, так і самастойна, калі нешта хвалюе. У Мінску сем цэнтраў ранняга ўмяшання, можна ўдакладніць, ці ёсць такі цэнтр на базе вашай паліклінікі або звяртацца ў іншую.

Пры дасягненні трохгадовага ўзросту, калі сімптомы захоўваюцца, у Мінску трэба звярнуцца ў сталічны клінічны цэнтр дзіцячай псіхіятрыі і псіхатэрапіі. Трэба сказаць, што тут існуе пэўны стэрэатып. Калі дзіця не размаўляе, многія навакольныя кажуць: пачакайце, у тры гады яно загаворыць. Бацькі чакаюць, і калі ў тры гады цуд не адбываецца, звяртаюцца да нас. Дзіця абследуюць, і пасля трохгадовага ўзросту выстаўляюць дыягназ.

Большасць такіх дзяцей мае патрэбу ў пастаяннай карэкцыйнай рабоце. Цяпер у Беларусі на базе дзіцячых садкоў існуюць розныя групы — лагапедычныя, тыя, што працуюць па праграме з цяжкасцямі ў навучанні, інтэграваныя. У залежнасці ад ступені выражанасці сімптомаў і асаблівасцяў выбіраюцца неабходны від і форма навучання. Для гэтага дзіця абследуе ўрач-псіхіятр, псіхолагі, псіхатэрапеўты. Акрамя таго, прымаецца рашэнне аб неабходнасці цьютара ў кожным канкрэтным выпадку. Здараецца, што неабходнае індывідуальнае суправаджэнне, часам дастаткова групавога цьютара, ёсць выпадкі, калі дзіцяці не патрэбны персанальны суправаджальнік і яно здольнае спраўляцца самастойна.

***— Чым дапамагаюць у цэнтрах ранняга ўмяшання?***

— Аўтызм — гэта не прыгавор, такія людзі могуць функцыянаваць самастойна. Атрымліваць адукацыю, прафесію, ствараць сям'ю. І ў большасці выпадкаў усё можа быць вельмі пазітыўна, калі займацца карэкцыяй. І чым раней яна пачатая, тым большая імавернасць максімальна скарэкціраваць паводзінскія асаблівасці. Гэта не значыць, што калі пачаць у шэсць гадоў, карэкцыя будзе горшая ці дзіця не даб'ецца поспехаў. Аднак калі пачаць яе ў тры гады, то да шасці гэтыя поспехі ўжо будуць.

***— У чым заключаецца карэкцыя?***

— У кожным асобным выпадку спецыяліст падбірае свой метад, які будзе максімальна эфектыўны. Паколькі аўтызм — гэта расстройства функцыянавання, то малое не набірае навыкі, характэрныя да свайго ўзросту, якія ў іншых дзяцей развіваюцца аўтаматычна. Асноўнае, на што скардзяцца бацькі, — дзеці не размаўляюць. Адпаведна, спецыяліст працуе з маўленнем, вучыць дзіця ўзаемадзейнічаць з дарослым сацыяльна прымальным спосабам. Карэкцыя накіравана на тое, каб навучыць чалавека паўнацэнна камунікаваць з навакольным светам. У нейкіх сітуацыях гэта можа выглядаць нетыпова.

***— Кажуць, што апошнім часам дзяцей з аўтызмам стала больш...***

— Гэта сапраўды так. Па даных Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, кожнае 90-е дзіця нараджаецца з расстройствам аўтыстычнага спектра, у тым ліку кожны 54-ы хлопчык. Гэта не значыць, што кожнаму з іх будзе выстаўлены дыягназ «дзіцячы аўтызм», але сімптомы ў спектры аўтызму будуць.

Ёсць некалькі здагадак, з чым можа быць звязана такая тэндэнцыя, але яны не маюць доказнай базы. Адной з прычын можна лічыць экалагічную абстаноўку і пагаршэнне ўмоў навакольнага асяроддзя. Але гэта толькі здагадкі, ніякай даказанай інфармацыі няма.

***— Чаму ўзнікае аўтызм?***

— Гэта прыроджаны стан, выкліканы пэўнымі паломкамі генаў. І ёсць некалькі тэорый, чаму так адбываецца, але ні адна з іх пакуль не з'яўляецца да канца даказанай, хоць даследаванні вядуцца шмат гадоў.

***— І гэта не звязана са з'яўленнем вялікай колькасці гаджэтаў у нашым жыцці?***

— Ні з імі, ні з характаралагічнымі асаблівасцямі мамы — гэта было абвергнута яшчэ ў 60-я гады мінулага стагоддзя. Гэтак жа як і папулярная тэорыя пра тое, што пасляродавая дэпрэсія мамы выклікае расстройства аўтыстычнага спектра ў дзіцяці. Усё гэта не адпавядае рэчаіснасці. Бацькі тут невінаватыя. Таксама як існуе пэўны стэрэатып, што вакцыны выклікаюць аўтызм. СААЗ правёў вялікія даследаванні на гэту тэму, і не знайшоў ніякіх пацвярджэнняў. Сапраўды, можна ўбачыць, што пасля ўвядзення вакцын паводзіны дзіцяці мяняюцца, але гэта звязана з тым, што яно нарадзілася з асаблівасцямі спектра аўтызму, і пэўны ўплыў на арганізм зрабіў гэтыя асаблівасці відавочнымі. Але яны б усё роўна абавязкова праявіліся.

Няпраўда і тое, што чалавек з аўтызмам абавязкова мае інтэлектуальную недастатковасць. Пры аўтызме яна праяўляецца з той жа частатой, што і пры іншых парушэннях, і не з'яўляецца асноўнай часткай гэтага парушэння. Яе можа і не быць.

***— Якую прафесію могуць у будучым выбіраць такія дзеці?***

— Дастаткова шмат людзей у Беларусі з асаблівасцямі аўтыстычнага спектра, якія атрымалі адукацыю і працуюць. Ёсць некаторы стэрэатып, што з людзей з аўтызмам вырастаюць праграмісты. Яшчэ яны становяцца ўрачамі, настаўнікамі, кіроўцамі — кім заўгодна.

***— Аўтызм можа выяўляцца ў падлеткавым узросце?***

— Такое здараецца, калі асаблівасці спектра аўтызму выражаны нязначна, і ў дзіцячым і малодшым школьным узросце бацькі знаходзяць тлумачэнні нейкім дзівацтвам свайго малога. Але большасць бацькоў усё ж звяртаецца раней — прыкладна ва ўзросце трэцяга класа.

> **«Асноўныя сімптомы — адсутнасць зрокавага кантакту і рэагавання на звернутую да малога размову бацькоў, аж да таго, што на пэўным узроставым этапе дзіця можа не пазнаваць сваіх блізкіх».**

***— Нараджэнне такога дзіцяці ў сям'і азначае, што жыццё бацькоў будзе складаная?***

— Жыццё бацькоў будзе крыху складанейшае. Для паспяховай карэкцыі добра, калі яны мяняюць свой спосаб жыцця. Ён не становіцца горшы ці лепшы, ён робіцца іншым. Лічыцца, што самая эфектыўная карэкцыя — паводзінскі падыход. Ёсць метад, які носіць назву «ўжытковы аналіз паводзін». На сёння ён лічыцца самым эфектыўным. Для чалавека з расстройствам аўтыстычнага спектра важна, каб жыццё было прадказальнае. Адпаведна, бацькі павінны ствараць такія ўмовы: рэжым дня, складанне візуальнага раскладу, дзе апісаны ўсе падзеі на найбліжэйшыя дзень і тыдзень. Папулярным з'яўляецца падыход, які называецца «кіруючы кантроль». Ён складаецца з сямі крокаў, якія бацькі павінны паступова ўкараняць, каб палепшыць камунікацыю дзіцяці з імі, бо такім чынам паляпшаецца камунікацыя з іншымі дарослымі і дзецьмі.

Калі мы кажам пра аўтызм, то размова ідзе пра доўгачасовую карэкцыю. Гэта можа быць як некалькі гадоў, так і некалькі дзесяцігоддзяў. Чалавек можа загаварыць у 1,5 года, у тры, а можа ў дзевяць ці ў 15, і нават у дарослым узросце. У любой сітуацыі трэба прыкладаць максімум намаганняў для атрымання выніку, і ён абавязкова будзе.

**Алена КРАВЕЦ.**

# «У ВАНЕСЫ З ДЗЯЦІНСТВА ХАРАКТАР ПЕРАМОЖЦЫ»



**(Заканчэнне.**
**Пачатак на 1-й стар. «СГ».)**

***— Валерый Вікенцьевіч, можаце згадаць, з якімі пачуццямі глядзелі выступленне Ванесы на Алімпійскіх гульнях у Токіа?***

— Цяпер я гляджу яе выступленні больш спакойна, чым раней. Калі маладая была, хваляваўся за яе ногі — там жа праходы ў ногі, перакаты розныя. І я баяўся больш за здароўе, чым за вынікі. А гэтым разам быў спакойны, бачыў, што Ванеса ў добрай форме і добра настроена. Вядома, і за вынік хваляваўся. У барацьбе ў кожнай катэгорыі толькі 16 чалавек, і ўсе дастойныя, раз заваявалі алімпійскія ліцэнзіі. У Ванесы была цяжкая жараб'ёўка: у яе васьмёрцы — вельмі салідныя саперніцы. А ў другой толькі японка вельмі моцная. Я чакаў другога круга. Думаў, калі яна яго пройдзе, можна быць спакойным. Я здзівіўся, калі Ванеса ў чвэрцьфінале лёгка разабралася з індыянкай Вінеш Вінеш. Магчыма, была занадта добра падрыхтаваная... Ну а далей ужо як атрымалася.

***— А можна быць занадта добра падрыхтаванай?***

— Можна быць гатовым настолькі, што ажно будзеш звінець ці ўвогуле перагарыш. Чалавек можа быць у выдатнай форме, але дапусціць маленькае паслабленне канцэнтрацыі, што скажацца на выніку. Я ў гэтым плане фаталіст, у кожнага свой лёс. Усе думаюць, што чалавек сам гаспадар свайго жыцця, але лёс мацнейшы. І якія б станцыі і караблі ён ні будаваў, прыйдзе цунамі, і будзе катастрофа. Прырода, лёс мацнейшыя за чалавека.

***— Успамінаецца булгакаўская размова Воланда і Берліёза на Патрыяршых прудах...***

— Менавіта так. Мне вельмі падабаецца іншы выраз з «Майстра і Маргарыты» — «Ніколі і нічога не прасіце! Ніколі і нічога, асабліва ў тых, хто мацнейшы за вас. Самі прапануюць і самі ўсё дадуць!».

***— Атрымліваецца, у Ванесы такі лёс — прайсці столькі выпрабаванняў і стаць алімпійскім прызёрам?***

— Канешне, гэта лёс. Але ж ёсць яшчэ і гены, спадчыннасць. Яна вырасла ў спартыўнай сям'і. Адзін каментатар неяк сказаў, што з такім характарам Ванеса можа стаць чэмпіёнкай свету ў любым відзе спорту. І гэта сапраўды так. Сапраўды, да кожнага віду спорту павінна быць схільнасць. Але заўсёды перамагаюць розум і характар. Фізічныя, тэхнічныя здольнасці прыкладна ва ўсіх спартсменаў аднолькавыя, а чэмпіёны вылучаюцца характарам.

***— Адкуль у вашай дачкі такі характар?***

— З дзяцінства яна была хлопчыкам у спадніцы. Пакуль мы з яе мамай расцілі гімнастак, Ванеса расла з братам і бабуляй. Хлопчыкі па двары бегаюць, па агароджах лазяць, і яна за імі. Стас на чатыры гады старэйшы, і яна за ім цягнулася. У мамы Ванесы такі ж характар, нават больш жорсткі. У мяне па маладосці такі характар быў у спорце, але я гэта перарос. Ад мяне ў дачкі ўменне думаць галавой, а ўпэўненасць у сабе і сваіх сілах — ад маці. Дарэчы, гэтая ўпэўненасць крыху і падвяла яе ў паўфінале Алімпійскіх гульняў. Мне здаецца, Ванеса на падсвядомым узроўні вырашыла, што раз ёсць перавага, значыць, можна паглядзець на прапановы саперніцы. Яна раней кіравалася прынцыпам «біла, б'ю і буду біць». Бываюць такія спартсмены, якія ідуць напралом.

***— Мабыць, для спорту гэта і нядрэнна?***

— Гэта характар пераможцы. Мара кожнага трэнера — знайсці спартсмена з псіхалогіяй «кілера», пераможцы. Напрыклад, у беларускай спартыўнай гімнастыцы на маёй памяці толькі два такія спартсмены — Света Багінская і Віталій Шчэрба. Былі таленавітыя спартсмены, але характары пераможцаў мелі толькі двое. І ў Ванесы з дзяцінства характар пераможцы. Яна не ўмела прайграваць, грэбавала нейкімі парадамі. Дачка заўсёды ведала, што ёй рабіць, як атакаваць. Гэта яе асаблівасць.

***— Як выхоўваць дзіця з такім характарам?***

— Ванеса ніколі не дастаўляла нам праблем, не піла, не курыла, не хуліганіла. Яна з дзяцінства моцная, разумная асоба. Заўсёды адстойвала сваё меркаванне, свой характар, лічыла, што так будзе лепей для ўсіх. І жыццё даказала, што ў многіх момантах яна мела рацыю. Бацькі заўсёды думаюць, што ведаюць, як лепш. Але трэба аналізаваць, што кажа дзіця, і прымаць гэта да ўвагі. У нас не было праблем з выхаваннем Ванесы, бо яна не рабіла нічога, што нельга было б прыняць.



***— Ванеса — татава дачка?***

— Яна незалежны чалавек з самых ранніх гадоў. Ёй трэба было да бацькі — ішла да мяне. Трэба было да мамы — ішла да мамы. Абараніць сябе яна заўсёды магла сама. Вядома, калі здараюцца крыўды ці несправядлівасць, па-бацькоўску хочацца абараніць. Кожны чалавек будзе абараняць сваё дзіця. Але я і сваім дзецям, і спартсменам заўсёды казаў, што ў кожным канфлікце вінаватыя два бакі. І ў першую чаргу трэба пытацца ў сябе, што не так.

***— Як лічыце, з такім характарам Ванеса можа стаць добрым трэнерам?***

— Добрыя трэнерскія гены ў сына Стаса. Ён выдатны трэнер, аналітык, педант. З Ванесы атрымаўся б супертрэнер. Яна не такі аналітык, як Стас. Але ўмее працаваць галавой, усё планаваць, кантраляваць, ведае тонкасці фізічнай падрыхтоўкі. Але яна не хоча. І ў прынцыпе правільна робіць — трэнерская праца вельмі няўдзячная. Паспеху дасягаюць адзінкі, а фізічнай і нервовай нагрузкі вельмі шмат.

***— Валерый Вікенцьевіч, чые выступленні вам глядзець цяжэй: сваіх спартсменаў альбо сваіх дзяцей?***

— Аднолькава. Я блізка да сэрца ўспрымаю выступленні і дачкі, і вучняў. Таму і пасівеў рана. Але стараюся быць спакойным. Мне вельмі спадабалася інтэрв'ю Генадзя Габрыляна, трэнера Марыі Ласіцкенэ. Ён расказваў, што, калі Марыя дапускае памылку, ён пра гэта не кажа, а дае ёй практыкаванне, якое выправіць гэтую памылку. То-бок ён працуе на падсвядомасць. Вынік мы бачылі — «золата» Алімпійскіх гульняў. Як у народзе кажуць, «не галоўнае — вайна, галоўнае — манеўры». Важна ўсё расставіць, падрыхтаваць, а спартсмены ўсё зробяць самі.

***— На сустрэчы алімпійцаў у аэрапорце Ванеса расказала, што жыць у спартыўнай сям'і цяжкавата. Што вы думаеце з гэты конт?***

— Трэба ўлічваць, што ўсе людзі з чэмпіёнскім характарам вельмі амбіцыйныя, і кожны лічыць сябе прафесіяналам у сваёй справе. Не мной прыдуманы выраз «кожны лічыць сябе стратэгам, бачачы бой збоку». Лёгка казаць ці вучыць іншага, а самому паспытаць? Таму, канешне, Ванесе складана, што мы часам каментуем яе выступленні. Яна ж не проста так трэніруецца — яна ведае, куды ёй ісці. І я заўсёды ёй казаў, што чалавек нараджаецца і памірае ў адзіночку. Хочаш зрабіць добра — зрабі сам. Калі нехта дапамог, прыслухайся, падзякуй, але канчатковае рашэнне за табой. Таксама і ў спорце. Усе кажуць, што трэба слухаць трэнера, выконваць яго планы. Але ж я сам галоўны трэнер і разумею, што ўсё павінна ісці ад самога спартсмена.

***— Вы заўсёды каментуеце яе выступленні?***

— Па гарачых слядах — ніколі. Я ведаю, што ёй гэта не спадабаецца. Адразу я маўчу, а недзе праз тыдзень пачынаем абмяркоўваць. Пасля Алімпійскіх гульняў тры тыдні не заікаўся. Аднойчы яна нават прызнала сваю памылку, але звычайна ўсё робіць па-свойму. Ванеса заўсёды мае рацыю.

***— Трэніровачныя планы вы складаеце разам з Ванесай?***

— Яна разам са мной. Ініцыятыва павінна ісці ад спартсмена. На пачатку сезона мы садзімся і плануем усе старты. Яна раіцца па нейкіх пытаннях. Ёй часта кажуць: «Ты шмат трэніруешся, трэба знізіць нагрузку». Але ж Ванеса сама разумее, што і калі рабіць, у яе ўсё распісана. Я нават сваім маленькім спартсменам кажу, што мама і тата нічога за іх не зробяць. І з дзяцінства вучу дзяцей думаць, чаму ты працуеш, навошта і як. Як у Гары Потэра: ён сам чараўнік, а ў яго ёсць настаўнікі. Вось я настаўнік для чараўнікоў.

***— Выхоўваючы дзяцей, вы кіраваліся гэтым жа прынцыпам?***

— Канешне. Мая мама была настаўніцай і часам мне казала, што я пешчу і не караю сына. А я казаў, што калі ён сам галавой не зразумее, што не мае рацыі, то пакаранне ні да чога добрага не прывядзе. Усё павінна ісці праз уласную галаву.

***— Валерый Вікенцьевіч, вам не крыўдна, што дзеці не сталі займацца спартыўнай гімнастыкай, якой вы прысвяцілі сваё жыццё?***

— Як прафесійнаму трэнеру крыху крыўдна. І ў Ванесы ў гімнастыцы было б пяць шанцаў заваяваць медаль — мнагаборства і чатыры снарады. А ў барацьбе толькі адзін шанц. Гімнастыка, асабліва жаночая, — самы цяжкі від спорту. Спартсменкі кожную хвіліну праз галаву перакульваюцца, шанцы ўпасці на шыю і атрымаць сур'ёзную траўму вялізныя. Ванеса свайго сына Савелія водзіць у школу «Колы славы» на спартыўную гімнастыку. Але я гэта не падтрымліваю. Гэта найскладанейшая праца. Яна лічыць, што ў гімнастыцы — дысцыпліна. Тут не пастаіш за спінай напарніка і пас не перададзеш, усё самому трэба рабіць.

***— Настаўнікі часта скардзяцца, што, выхоўваючы чужых дзяцей, не ўдзялілі досыць часу сваім. А як з гэтым справы ў трэнераў?***

— Гэта і мая праблема таксама. Калі Ванеса была маленькая, я быў увесь у працы. У 1992 годзе яна нарадзілася, а ў 1996-м мы ўпершыню паехалі на Алімпійскія гульні суверэннай краінай. І чатыры гады я яе амаль не бачыў. І потым шмат часу праводзіў у зале. Аднойчы ва ўжо досыць дарослым узросце яна мне гэта выказала. Але Ванеса моцны чалавек, і, я думаю, такія сантыменты яна не прымае. Мы заўсёды знаходзілі час, каб пабыць разам. Калі я жыў у Аўстраліі, было цяжэй. Ужывую бачыліся толькі некалькі разоў, а так у асноўным усе зносіны былі па тэлефоне.

***— Калі дапамагалі Ванесе вяртацца ў спорт пасля родаў, не шкада было дачку нагружаць?***

— Якое там, ніякага шкадавання не было! Яна спартсмен, прыйшла на трэніроўку — трэніруйся. Каляску з Савеліем у залу прывезла — і пайшла трэніравацца. Малы заплакаў, я падышоў, супакоіў, і далей працаваць! Яна нават з ім на руках прэс качала. Яна ж сама сваё жыццё ў зале пачала. Ванеса — адзіная з маіх траіх дзяцей, каго я забіраў з раддома. Старэйшая нарадзілася, жонка ў акно паказала, і я на спаборніцтвы паехаў. Са Стасам такая ж сітуацыя. А Ванеса нарадзілася 27 снежня. Якія спаборніцтвы могуць быць? Да жонкі прыйшоў урач, сказаў, што ў нас здаровае дзіця, а ў раддоме вірус нейкі, таму трэба ехаць дадому, але нелегальна. Я пад'ехаў на машыне, жонка мне дачку праз акно на першым паверсе перадала. Сама выйшла і мы паехалі адразу ў залу. Было 30 снежня, там быў ранішнік. А ў мяне вялікі «стаж» працы Дзедам Марозам. Ну мы Ванесу прывезлі туды, а я пераапрануўся і пайшоў працаваць. Так усе мае дзеці і выраслі ў спартыўнай зале. І Савелій зараз там расце, і дзеці Рэнаты таксама.

***— То-бок у Ванесы не было выбару, чым займацца?***

— Можна і так сказаць. А я заўсёды казаў, што гэта не ў мяне трое дзяцей, а ў маёй жонкі. Але ж і мае спартсмены — мае дзеці. Памятаю, сядзім з Ленай Піскун у Італіі. У яе бяруць інтэрв'ю, пытаюцца пра бацькоў, яна расказвае пра маму. Пачынае гаварыць пра тату, а журналіст яе перабівае, кажа, што пра тату ўсё ведае, і паказвае на мяне: маўляў, вось жа ён. Атрымліваецца, што я шматдзетны бацька.

***— Валерый Вікенцьевіч, да ўнукаў у вас іншае стаўленне, чым да дзяцей?***

— Унукаў больш шкадуеш, абараняеш. А ад дзяцей больш патрабуеш. Савелій яшчэ той гарэза. З яго трэба пытацца, трымаць яго ў вожыкавых рукавіцах. Але, калі Ванеса на яго сварыцца, я нагадваю, што яна сама ў такім узросце яшчэ горш рабіла. Дысцыпліна патрэбная, але ўсё роўна шкадую.

***— Валерый Вікенцьевіч, а часта вам удаецца ўдзяліць час самому сабе?***

— Зараз стараюся актыўна гэтым займацца. Усё жыццё было вялікае нервовае напружанне, прыходзілася браць на сябе шмат адказнасці. Памятаю, у Аўстраліі я першы год працаваў асістэнтам трэнера з малымі. І разам з намі ў адным цэнтры аўстралійская зборная рыхтавалася да Алімпійскіх гульняў 2004 года. І мне так добра было — я назіраў з балкона, размаўляў з калегамі, галава амаль не балела. А тут столькі адказнасці, а я хачу проста спакойна пажыць. Аднак пакуль спакой нам толькі сніцца.

***— Нашы дзеці будуць лепшыя, чым мы?***

— Безумоўна. Я быў пасрэдны спартсмен з сярэднімі данымі. І мае дзеці мяне пераўзышлі. І гэта вельмі добра. Гэта прагрэс, так і павінна быць.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота з асабістага архіва героя.**

Псіхалагічны практыкум

# У МУЖА З'ЯВІЛАСЯ ІНШАЯ,

## або «Дарагая, гэта зусім не тое, пра што ты падумала!»

**Здрада аднаго з партнёраў у шлюбе — цяжкае выпрабаванне для другога. І часцей за ўсё з гэтым выпрабаваннем сутыкаюцца жанчыны. Ці варта захоўваць шлюб, калі ў мужа ёсць іншая? І калі так, то як гэта зрабіць? Спытаем у псіхолагаў.**

### АДКУЛЬ ЯНА ЎЗЯЛАСЯ?

Ці бывае вечнае каханне? Бывае, адзначаюць псіхолагі. Праўда, дасягаюць яго нешматлікія пары. Галоўны складнік такіх адносін — адчуванне эксклюзіўнасці свайго партнёра.

— Гэта тое, што найбольш каштоўна для вас у вашым выбранніку. Разумение, што ні адзін іншы партнёр не зможа даць вам тое, што даюць адносіны з гэтым чалавекам, — падкрэслівае **сямейны псіхолаг, гештальт-тэрапеўт Сяргей ЯРАВЕЦ.**

Людзі — і мужчыны, і жанчыны — істоты палігамныя, адзначаюць псіхолагі. Не выключана, што ў нейкі момант той, хто шануе эксклюзіўнасць свайго партнёра, таксама можа адчуць жаданне здрадзіць. Але яго спыніць думка аб тым, колькі болю ён прынясе любімаму чалавеку. Гэта сталыя асобы, здольныя ўсвядоміць імпульс і прааналізаваць наступствы. Таму што важная частка кахання — гэта адказнасць перад партнёрам, кажа суразмоўца.

Часцей прычыны, па якіх мужчына не здраджвае жонцы пасля многіх гадоў шлюбу, не настолькі сталыя і ўсвядомленыя. Напрыклад, гэта можа быць сарамлівасць або слабая палавая канстытуцыя. Муж здрадзіў бы жонцы, але ён трывожны чалавек, якому складана заводзіць знаёмствы. Або яму патрабуецца шмат часу, каб дасягнуць з новай партнёркай узроўню псіхалагічнага камфорту. Ці можна такую вернасць назваць вернасцю?

**Найбольш правільны адказ на сітуацыю — любоў, кажуць псіхолагі. Любоў да сябе і адчуванне ўласнай каштоўнасці.**

— Калі ў вашым жыцці з'явілася «трэцяя лішняя», перш за ўсё задайце сабе пытанні: чаму яна з'явілася і якую ролю яна адыгрывае ў жыцці вашай сям'і? І зусім ужо, на першы погляд, дзіўнае пытанне: ці сапраўды палюбоўніца мужа перашкаджае вашаму шчасцю?

Пытанне не настолькі недарэчнае, як можа падацца, сцвярджаюць псіхолагі. Часам захаваць шлюб людзям дазваляюць... менавіта адносіны на баку. Палюбоўніца — свайго роду «псіхатэрапеўт», і, здараецца, яна, сама таго не жадаючы, умацоўвае шлюб мужчыны, паколькі бярэ на сябе частку функцый жонкі. І палюбоўнік жонкі таксама нярэдка ўмацоўвае сям'ю. Калі б у многіх мужчын і жанчын не было палюбоўніц і палюбоўнікаў, ім давялося б паглядзець на сваё партнёрства адкрыта і сумленна. І ўбачыць, што ў ім няма даверу, любові, блізкасці, і задумацца, ці трэба гэтыя адносіны захоўваць. Пачуццё віны — выдатны «клей», які склейвае людзей на многія гады.

— Вельмі важна адказаць на прыведзеныя вышэй пытанні сумленна, — адзначае спецыяліст.

Рэч у тым, што нярэдка палюбоўніца з'яўляецца ў мужа з маўклівай, часцей за ўсё падсвядомай згоды жонкі. Напрыклад, адносіны з мужам даўно сталі для жанчыны «каменем на шыі», але сысці ў яе па тых ці іншых прычынах магчымасці няма. Ёй псіхалагічна камфортна, калі муж адсутнічае дома — і ён усё часцей «затрымліваецца на працы» або «едзе ў камандзіроўку». Альбо мужчына каштоўны для жанчыны толькі як бацька яе дзяцей, таму яна захоўвае шлюб. Але кахання і даверу паміж імі ўжо няма, і сам па сабе ён жанчыне даўно не патрэбны. Чаму ж яна абураецца, даведаўшыся пра палюбоўніцу? Гэтага патрабуе грамадская мараль і выхаванне ў бацькоўскай сям'і. Але на самай справе моцных эмоцый у яе душы з гэтай нагоды няма — ёй, хутчэй, усё роўна.

— Калі гэта ваш выпадак і вы змаглі сумленна сабе ў гэтым прызнацца, варта задумацца, ці сапраўды вам трэба захоўваць адносіны. Калі ж гэта не так, тады за сям'ю варта пазмагацца.

### ФОТАРОБАТ ЗДРАДНІКА

Здрада мужчыны (разавая або шматлікія) — мабыць, адна з самых частых праблем, у якой даводзіцца разбірацца сямейным псіхолагам. Матэрыял для даследаванняў велізарны. І псіхолагі высветлілі, што існуюць псіхалагічныя тыпажы мужчын, якія схільныя здраджваць сваім жонкам. Такім чынам, партрэт патэнцыяльнага здрадніка.

**«Пераможца».** Чым больш у яго «перамог», тым вышэй адчуванне ўласнай каштоўнасці. Такія мужчыны — часта прадукт дэструктыўных зносін у бацькоўскай сям'і. Нярэдка гэта хлопчыкі, выхаваныя адной мамай, якая любіла паўтараць: «Ты такі ж, як твой бацька!» і «Усе мужчыны сво...». Або сям'я была поўнай, але адносіны паміж бацькам і маці былі канфліктныя, і пераможцам з гэтых канфліктаў заўсёды выходзіў бацька. У такой сям'і з уладным, жорсткім бацькам у дзіцяці фарміруецца перакананне, што сіла спалучаная з «мужчынскім», а слабасць — з «жаночым» (прычым каханне, вернасць, давер, мяккасць ён падсвядома адносіць да «жаночага»). Жэняцца такія мужчыны, каб адпавядаць сацыяльнаму запыту: нарадзіць сына, пабудаваць дом, пасадзіць дрэва. Пры гэтым «пераможца» падабаецца навакольным, нярэдка ён займае кіруючую пасаду, таму што імкнецца да ўлады і сілы. І калі такі мужчына сыходзіць з сям'і ці заводзіць палюбоўніцу, здаецца, што вінаваты хто заўгодна, толькі не ён: вінаватая «дрэнная жанчына»-палюбоўніца, жонка, што недастаткова кахала, або людзі, якія агаварылі ні ў чым не вінаватага.

**«Пацярпелы».** Гэты тып мужчын здраджваць увогуле не збіраўся і заводзіць палюбоўніцу не хацеў. Проста, застаўшыся адзін (дапусцім, жонка з дзецьмі з'ехалі на некалькі дзён), ён паддаецца націску выпадкова сустрэтай жанчыны і вырашае даказаць сабе, што «яшчэ о-го-го!». Але «аднаразовая» сувязь супраць яго волі перарастае ў пастаянную — жанчына пачынае праследаваць яго, патрабуючы «працягу банкету». Мужчына аказваецца ў пастцы. Найбольш частае развіццё падзей — ён ва ўсім прызнаецца жонцы, яны аб'ядноўваюцца і разам выганяюць са свайго жыцця «разлучніцу». І ў канчатковым выніку гэта ўмацоўвае іх шлюб.



**«Шукальнік».** Такі мужчына верыць: «На свеце ёсць мая палавінка, і ў рэшце рэшт мы знойдзем адно аднаго». Перыядычна ён знаходзіць «тую самую», але потым аказваецца, што гэта «зноў не тая». Менавіта так ён жэніцца і непазбежна расчароўваецца, а значыць, працягвае пошук. Пры гэтым з сям'і такі мужчына не сыходзіць па прычынах, не звязаных з каханнем да жонкі: неабходнасць дзяліць кватэру, прыхільнасць да дзяцей, агульныя крэдыты і г. д. Калі такі мужчына бачыць, што і палюбоўніца таксама далёкая ад яго ідэалу, ён расчароўваецца, некаторы час пакутуе і зноў шукае. І заўсёды вяртаецца да жонкі, праўда, вяртаецца фактычна, але не эмацыянальна.

**«Стомлены».** Гэты мужчына стаміўся ад руціны сямейных адносін, ад матэрыяльных і псіхалагічных складанасцяў. Яго здрады абумоўлены эмацыянальным выгараннем. Трэба аддаць яму належнае — выбудаваць даверлівыя адносіны з жонкай ён спрабаваў шмат гадоў. Але па розных прычынах яму гэта не ўдалося. І цяпер пошукі кахання і цяпла ў яго звязаны з эмацыянальнай дыстанцыяй ад жонкі. Як правіла, «стомлены» расчароўваецца ў адносінах з жонкай, але застаецца ў шлюбе з-за пачуцця абавязку і віны перад сям'ёй.

**«Паэт».** Ён шукае рамантыкі, лёгкасці, флірту, якіх не знаходзіць у шлюбе. Такі мужчына нават з палюбоўніцай не здольны на доўгія і сур'ёзныя адносіны. Хоць сувязь на баку ў яго можа доўжыцца некалькі гадоў — да таго часу, пакуль яна дазваляе сысці ад штодзённасці. Але як толькі палюбоўніца пачынае «апрацоўваць» яго на прадмет «сысці з сям'і і ажаніцца з ёй»... Больш за тое, як толькі яна наогул пачынае патрабаваць нейкіх дзеянняў, акрамя кветак і сексу, ён тут жа шукае новае «каханне без абавязацельстваў».

**«Мнагажэнец».** У такога мужчыны працяглыя рамантычныя адносіны на баку рана ці позна перарастаюць у другую сям'ю. Яго здрады абумоўлены шматгадовай эмацыянальнай сувяззю з дзвюма рознымі жанчынамі. Яны абедзве дарагія яму. Звычайна гэтыя дзве сям'і ўраўнаважваюць адна другую. Часцей да афіцыйнай жонкі ён прывязаны як да блізкага сябра, у іх нярэдка агульная сфера прафесійных інтарэсаў або агульны бізнес, іх звязваюць дзеці і цёплыя ўспаміны маладосці. Яна дае яму ўтульнасць і падтрымку. Палюбоўніца, а дакладней «малодшая жонка», — гэта фізічнае задавальненне, яна дорыць свята і маладосць. Такія адносіны, як правіла, доўжацца ўсё жыццё. Нягледзячы на ўласную нявернасць абедзвюм жанчынам, вестка пра тое, што адна з іх здрадзіла яму, можа прывесці такога мужчыну ў лютасць. Ён на час прыпыняе адносіны з іншай сям'ёй, каб вярнуць «блудніцу» назад, і ўсё вяртаецца на ранейшыя месцы.

### ТАК МНЕ І ТРЭБА?

Як паводзіць сябе жанчыне, якая даведалася, што ў мужа ёсць палюбоўніца? Перш за ўсё — не вінавацьце сябе!

— Як правіла, у такой сітуацыі ў жанчыны рэзка падае самаацэнка, — кажа спецыяліст. — Яе вынік, можа развіцца дэпрэсія.

Тым больш што некаторыя мужчыны, каб апраўдацца, зневажаюць жонку, распавядаючы ёй пра яе недахопы, якія штурхнулі яго ў абдымкі разлучніцы. І тут важна не дазволіць абясцэніць сябе ва ўласных вачах. Калі схільнуць эмоцыі, мужчына будзе сам шкадаваць аб гэтых словах.

Найбольш правільны адказ на сітуацыю — любоў, кажуць псіхолагі. Любоў да сябе і адчуванне ўласнай каштоўнасці. Але ўсё гэта прыйдзе пазней. Спачатку ж, даведаўшыся пра палюбоўніцу, не варта адразу нічога прадпрымаць. Рашэнне аб далейшым жыцці варта прыняць, калі жарсці трохі ўлягуцца. І абгрунтавана выказаць яго мужу.

**Пачуццё віны — выдатны «клей», які склейвае людзей на многія гады.**

Алгарытм просты:

• Прыняць рашэнне аб працягу або завяршэнні адносін.

• Калі адносіны будуць працягнутыя, зрабіць так, каб здраднік быў пакараны: не адчуваў, што яму «наўпрост даравалі», а сумленна «адпрацаваў» свае грахі. Толькі пасля гэтага можна аднаўляць былы давер.

Калі вы вырашылі захаваць шлюб (пры ўмове, што муж згодны разарваць сувязь на баку), то рашэнне «дараваць і забыць» — так сабе варыянт. Таму што цалкам дараваць здрадніку вы ўсё роўна не зможаце. І гэта раней ці пазней разбурыць сям'ю: партнёр будзе пастаянна адчуваць, што ён нікчэмнасць, а з ім жыве «святая жанчына». А гэта, пагадзіцеся, не лепшы «падмурак». Гаворка тут ідзе аб аднаўленні справядлівасці. Калі хочаце, аб кантрыбуцыі. Вы павінны дакладна вызначыць матэрыяльны або паводніцкі эквівалент псіхалагічнай шкоды, якую нанёс вам, здрадзіўшы, муж. І пасля выканання ім вашых умоў да правіны ўжо не вяртацца. Толькі так атрымаецца выраўнаваць адносіны.

### А КАЛІ ВЫ РАЗВІТВАЕЦЕСЯ?

✓ Калі мужчына хоча сысці — адпусціце яго без слёз, папрокаў і пагроз. Забаронены плод салодкі, але калі ён перастае быць забароненым, частка рамантычнага флёру аўтаматычна знікае.

✓ Калі вы рассталіся з мужам, некалькі тыдняў будзеце адчуваць сябе вельмі дрэнна: рэўнасць, крыўда, расчараванне і няўпэўненасць атруцяць жыццё. Але тое, наколькі хутка гэтыя «дэманы» пакінуць вашу душу, залежыць толькі ад вас. Кантактуйце з новымі людзьмі, знайдзіце незвычайнае хобі або ўспомніце даўно забытае захапленне, цешце сябе прыемнымі сюрпрызамі. І паступова ваш унутраны стан вернецца ў норму. Вы павінны самі пажадаць расстацца з эмоцыямі, што прыносяць боль.

✓ Ваша задача — аднаўленне асобасных каштоўнасцяў. Час задумацца аб уласных інтарэсах, аб тым, што хочацца рабіць у гэтым жыцці вам самой.

✓ Не варта ўмешвацца ў жыццё «былога». Нават калі вы гарача хочаце яго вярнуць, лепш дайце яму права выбару. І тады, цалкам верагодна, неўзабаве ён пажадае вярнуцца да вас. А вось прымаць яго ці не ў ваша новае жыццё і ці патрэбны ён цяпер, вырашаць толькі вам!

**Дзіяна РОНІНА.**

Вечныя каштоўнасці

# МОДА НА СЯМ'Ю ЗУСІМ ПРАЙШЛА?

**На працягу стагоддзяў сям'я ў нашай культуры лічылася той крэпасцю, дзе можна было схавацца ад усіх бед і няшчасцяў. Нягледзячы на пераэжытыя ўзрушэнні і трансфармацыі, сям'я выстаяла ў XX стагоддзі. Ці захаваецца яна ў XXI? Чым тлумачыцца вялікая колькасць разводаў і адзінокіх людзей, якія не жадаюць уступаць у шлюб? Што спараджае канфлікт бацькоў і дзяцей і як яго пераадолець? Пра гэта наша размова з прафесарам кафедры сацыяльнай камунікацыі факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ, доктарам гістарычных навук, дацэнтам Ірынай КАЛАЧОВАЙ.**


Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

## НЕ ПОЛЕ ПЕРАЙСЦІ

***— Усе даследаванні, якія праводзіліся да нядаўняга часу, паказвалі: у сістэме каштоўнасцяў беларусаў сям'я па-ранейшаму займае лідзіруючыя пазіцыі. І пры гэтым больш за палову шлюбаў распадаецца. Як вы пракаментуеце такую сітуацыю?***

— Сям'я — правераная часам каштоўнасць. Таму моладзь і сёння ад яе не адмаўляецца. Але, на жаль, стварэнне сям'і часта звязваюць у першую чаргу з задавальненнем, камфортам, забываючы пра абмежаванні, абавязкі, клопат пра блізкіх, пра тое, што жыццё ў сям'і — гэта і навука, і мастацтва. Новае пакаленне беларусаў вельмі інтэлектуальнае і адукаванае. Але пры гэтым у многіх юнакоў і дзяўчат не сфарміраваны сацыяльныя навыкі. Ім не хапае адказнасці, арганізаванасці, дысцыпліны. Статыстыка паказвае: муж і жонка разводзяцца, як правіла, на пачатковым этапе станаўлення сям'і. Можа, яны папросту аказваюцца не гатовыя да сямейных будняў і складанасцяў, не ўмеюць саступаць адзін аднаму, трываць, не імкнуцца зразумець партнёра? Чаму сёння так распаўсюджана праблема нявыплаты аліментаў пасля разводаў? На мой погляд, многія мужчыны лічаць: развітаўшыся з жонкай, яны ўжо не абавязаны клапаціцца пра дзіця.

**«На жаль, у нас так і не склалася стройная сістэма выхавання адказнага бацькоўства. Многае дэкларавалася, шэраг правільных крокаў прадпрымалася, але яны не насілі сістэмнага характару і не даводзіліся да канца».**

У патрыярхальнай сям'і з пакалення ў пакаленне перадавалася перакананне: бацькоўства — раз і назаўсёды дадзеная місія. Бацькі падтрымлівалі дзяцей да той пары, пакуль тыя самі не бралі шлюб. Гэта вельмі змацоўвала адносіны паміж жонкай і мужам: нават калі здараліся сваркі і непаразуменні, яны не ляпалі дзвярыма.

***— Чым, на ваш погляд, тлумачыцца позняя сацыялізацыя сучаснай моладзі?***

— Сацыяльныя навыкі фарміруюцца ў працэсе дзейнасці. У патрыярхальнай сям'і дзеці з ранніх гадоў далучаліся да працы, вучыліся ўзаемадзейнічаць у калектыве. Вядома, свет змяніўся, узровень жыцця прыкметна ўзрос.

З аднаго боку, сучасных бацькоў можна пахваліць за тое, што яны жадаюць даць сынам і дачкам самае лепшае. Але дзе тая мяжа паміж любоўю і патрабавальнасцю? Пакаленне, якое вырасла ў цяплічных умовах, хоча атрымліваць ад жыцця ўсё па найвышэйшым разрадзе, не прыкладаючы вялікіх намаганняў. Гэтаму спрыяе і магутная прапаганда спажывецтва. А ёсць яшчэ новае інфармацыйнае асяроддзе.

У паглыбленых у віртуальную рэальнасць маладых людзей часта не фарміруюцца нармальныя камунікатыўныя навыкі. Хлопцы да 30 гадоў затрымліваюцца ў бацькоўскім гняздзе, становяцца недаступнымі для зносін і знаёмства з дзяўчатамі. Размаўляючы са студэнткамі, бачу, што многія з іх не задумваюцца аб стварэнні сям'і, аб тым, з кім і як яны будуць жыць, гадаваць дзяцей. Празмерная эмацыянальнасць, інфантыльнасць робіць гэта пакаленне вельмі ўразлівым.

***— Але пазнейшыя шлюбы і больш сталае мацярынства — агульнаеўрапейская тэндэнцыя. Моладзь хоча спачатку адбыцца прафесійна, забяспечыць фінансавы дабрабыт, а ўжо потым ствараць сям'ю. Сталае бацькоўства, як правіла, больш адказнае.***

| 2 | Капитальное строение с инвентарным номером 500/С-47411 общей площадью 2 881,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Долгобродская, 18/12, наименование – корпус очистных сооружений, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения | | 874 080,0 | 87 000,0 |
| 3 | Капитальное строение* с инвентарным номером 500/С-52784 общей площадью 10 546,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Долгобродская, 18/8, наименование – литейный цех, назначение – здание специализированное для металлургического производства и металлообработки | | 2 965 680,0 | 296 000,0 |
| 4 | Капитальное строение** с инвентарным номером 500/С-17398 общей площадью 19 918,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Долгобродская, 18, наименование – литер В 1-3/к, блок цехов, назначение – здание неустановленного назначения | | 7 576 320,0 | 757 000,0 |

** Часть капитального строения (назначение – ЦРП) площадью 156,9 кв. м, примыкающая к зданию литейного цеха с инвентарным номером 500/С-52784, не подлежит сносу или переносу и является неотъемлемой частью ОАО «МЗАЛ им П.М. Машерова».*
*** Площади капитального строения освобождаются продавцом имущества в течение года*

**Продавец имущества:** ОАО «МЗАЛ им. П.М. Машерова», ул. Долгобродская, 18, 220037, г. Минск.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условия торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МЗАЛ им. П.М. Машерова», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток (задатки) и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток (задатки) перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах от 18.10.2021 по предмету торгов № _.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **18 октября 2021 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов). Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 07.10.2021 по 15.10.2021** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону (029) 664 60 02.

**Телефоны для справок:** (017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 358 69 02, (029) 664 60 02 (ОАО «МЗАЛ им. П.М. Машерова».

Дополнительная информация размещена на сайте **www.mgcn.by** в разделе «Недвижимость в собственность».

УНП 100599687

## Информация о совершении сделок, в отношении которых имеется заинтересованность аффилированных лиц

ОДО «ТУТ и ТАМ Логистикс»

Местонахождение: 220075, г. Минск, ул. Селицкого, 21Б, пом. 1, комн. 30.

Дата принятия решения о совершении сделок: 29.09.2021 г.

Вид сделок: заключение дополнительных соглашений к договорам займа № 06 от 26.06.06 г., № 07 от 20.07.06 г., № 09 от 10.12.07 г., № 11 от 24.02.12 г., № 13 от 03.02.14 г., № 1/21 от 06.04.21 г.

Стороны сделки: Займодавец – Компания «Полиплан Холдингс Лимитед» (POLYPLAN HOLDINGS LIMITED), Заемщик – ОДО «ТУТ и ТАМ Логистикс».

Предмет сделки:

1. Продление срока возврата сумм займов: не позднее 31.12.2024 г., но не ранее 01.08.2024 г.

2. Заимодавец не вправе требовать досрочного возврата предоставленного займа, за исключением случаев, предусмотренных императивными нормами применимого права.

Критерий заинтересованности аффилированных лиц: Аффилированное лицо, Компания «Полиплан Холдингс Лимитед» (Polyplan Holdings Limited), является стороной сделки; Аффилированное лицо, Компания «Полиплан Холдингс Лимитед» (Polyplan Holdings Limited) владеет 20 % и более долей в уставном фонде ОДО «ТУТ и ТАМ Логистикс», являющегося стороной сделки; Аффилированное лицо, Компания «Полиплан Холдингс Лимитед» (Polyplan Holdings Limited), является высшим органом управления ОДО «ТУТ и ТАМ Логистикс», являющегося стороной сделки.

Сумма взаимосвязанных сделок: 6 747 тыс. белорусских рублей по состоянию на 30.06.2021 г.

Балансовая стоимость активов Общества: 39 660 тыс. белорусских рублей по состоянию на 30.06.2021 г.

Генеральный директор О.М. Маргун

З канверта

# Рыжы матылёк

Гэтакія дні бываюць толькі ў жніўні. Лета ідзе да завяршэння, вее спеласцю каласоў, травы губляюць насенне. Паўдзённая спёка і шчодра напоўненае водарамі паветра запаўняюць усе куткі прасторы паміж небам і зямлёй...

На Сашаву магілку ў дзень яго нараджэння мы прыйшлі ўчатырох, самыя блізкія яму людзі. Мама Сашы, я і дзве нашы дачушкі. Час яшчэ не прытупіў болю ад страты, пяць месяцаў як я была ўдавой, але свядомасць пярэчыла прыняццю гэтага факта.

Мы сядзелі сярод травы на разасланым покрыве побач з магілкай і па славянскім звычаі памянілі Сашу. Вакол стракаталі конікі, на магіле чырванелі кветкі. Было цёпла і сонечна. Адчуванне, што муж нас бачыць, напоўніла мяне. Кожнай клетачкай я адчула яго прысутнасць.

«Не ведаю, можа, гэта мне здаецца, але я адчуваю, што Саша бачыць нас, ён тут і рады, што мы прыйшлі яго наведаць», — сказала я. Тры пары вачэй са здзіўленнем паглядзелі на мяне — свякроў і дзеці адчувалі тое ж!

Пасля пахавання я доўга смуткавала, але цяпер мне не было самотна. Не ведаю, як гэта назваць: ваганні энергіі ці вібрацыі тонкага плана, але мне падалося, што Саша адказаў мне шолахам лісця. Як і раней, нам было добра ўсім разам.

Свякроў сказала: «Мусіць, усё ж такі ёсць Бог і ёсць Той свет. Не можа быць, каб людзі проста знікалі ў нікуды. Можа, ён побач і глядзіць на нас?» У гэты момант над намі закружыўся матылёк. Ён лётаў, махаў крылцамі над дзецьмі, падлятаў то да мяне, то да іх, то да свякрухі. Раптоўна я ўсвядоміла: «Глядзіце, ён рыжы!» Матылёк быў сапраўды рыжы, і ўсе змоўклі, гледзячы на яго. Саша таксама быў рыжы, зусім рыжы, рыжэй не бывае.

Тады Алеся, старэйшая дачка, якой было дванаццаць гадоў, нечакана ўсклікнула: «Гэта тата! Гэта ягоная душа!» Яна звярнулася да рыжага матылька: «Калі ты татава душа, толькі калі ты душа майго таты, калі ласка, сядзь на мяне, каб мы ведалі, што гэта тата».



Дзяўчынка яшчэ не скончыла фразу, а матылёк ужо сядзеў у яе на лбе. Прама па цэнтры. Потым ускочыла маленькая Танечка: «Душа таты, сядзь, калі ласка, на мяне!» — і працягнула ручку. Мы са здзіўленнем назіралі, як матылёк пераляцеў на працягнутую дзіцячую ручку. Ад хвалявання вяснушкі на шчочках дзяўчынкі сталі яшчэ ярчэйшымі, яна таксама была рыжая.

Танечка замоўкла, яна баялася спалохаць ці неяк патурбаваць рыжага матылька. Дзяўчынка глядзела на яго захоплена і была ўпэўненая, што гэта душа яе таты. У вялікіх блакітных вачах дзіцяці свяціліся вера і любоў. Мы былі ўражаны. Не ведаю, ці дарэчы тут гэта слова, але мы былі шчаслівыя. Мы ведалі, што Саша нас чуе, бачыць, разумее. Ён побач, ён рады, што мы яго памятаем, што мы прыйшлі, і спрабуе нам сказаць пра гэта. Мы былі ўсе разам.

Калі мы страчваем блізкіх нам людзей, разам з імі мы страчваем частку сябе. Пачуццё незваротнасці аглушальнае, гэту пустэчу нельга нічым запоўніць. І заўсёды застаецца недагаворанасць, мы заўсёды не паспяваем сказаць блізкім, як моцна мы іх любім, маем патрэбу ў іх. Зараз вышэйшай сілай, самім Сусветам нам была дадзена такая магчымасць.

Адчуванне пустэчы адступіла, гэта быў момант перасячэння паралельных светаў. Мы па чарзе гаварылі з татам, расказвалі, як жывём без яго, як бы хацелі, каб ён быў з намі і як мы яго любім. А матылёк кружыў і кружыў, лёгка пырхаючы, і час ад часу садзіўся каму-небудзь на плячо або працягнутую руку.

Тады мы доўга прабылі на могілках, а потым матылёк паляцеў. Куды і як, ніхто цяпер не можа ўспомніць. Мы вярталіся дадому з лёгкім сэрцам, удзячныя за магчымасць сустрэцца і пагаварыць з роднай душой.

***

Прайшло дваццаць гадоў. Ніхто з нас не забыўся пра той летні дзень і рыжага матылька. Дзеці сталі дарослымі, працуюць, маюць сем'і, але да гэтага часу лічаць, што рыжы матылёк быў душой іх таты. Сусвет даў нам магчымасць сказаць яму аб нашай любові.

**Валянціна БЫСТРЫМОВІЧ.**

# Гарбуз любіць цяпло!

**У кожнага сорту або віду гарбузоў ёсць свае тэрміны паспявання: ранняспелыя спеюць, як правіла, дзесьці ў канцы жніўня ці пачатку верасня. Сярэдняспелыя гарбузы — трохі пазней: у верасні, а вось познаспелыя і зусім выспяваюць да канца верасня або нават у кастрычніку. У кожнага сорту гарбузоў свая колькасць дзён да паспявання: у ранняспелых — 90—105 дзён пасля высадкі расады, у сярэдняспелых — 105—120 дзён, а вось у познаспелых — 120—140 дзён. Кожны сорт гарбузоў мае асаблівасці. На сваёй дачы мы практыкуем і вырошчваем буйнаплодныя гарбузы, якія характарызуюцца асаблівым смакам мякаці і добра захоўваюцца. Плеці гарбузоў раскідваюцца літаральна па ўсім агародзе — на 5-7 метраў, пераплятаючыся нават з плецямі кавуноў.**



Буйнаплодныя і мускатныя гарбузы — наша хобі. Яны штогод цешаць багатым ураджаем. Мы вырошчваем у сябе ў асноўным познаспелыя і менавіта буйнагабарытныя, ураджай якіх захоўваецца ў склепе да 6 месяцаў, гэта значыць, усю зіму. Нас цешаць такія сарты і разнавіднасці, як «Зімовая салодкая», «Сталовая зімовая», «Зорка», «Мармуровая» і іншыя.

За гарбузом патрэбен далікатны догляд. Час захавання кожнага плода мы вызначаем па афарбоўцы: ён павінен быць насычаным і яркім. А яшчэ пладаножка да моманту паспявання падсыхае. Калі пастукаць па корцы плода, гук павінен быць шчыльна глухі. Пры зняцці або зрэзцы паспелых пладоў пакідаем хвосцік даўжынёй у 6—7 см. Але вось пераносіць або транспартаваць за хвосцік не рэкамендуецца. Ён служыць менавіта для падсілкоўвання плода і вызначэння тэрміну паспявання.

Для восеньскага часу характэрна з'яўленне начных замаразкаў, таму познаспелыя гарбузы на ноч трэба накрываць мешкавінай або цёплай тканінай, а пад ніз кожнага вялікага плода падкласці подсціл (дошчачку або ўпакоўку з-пад курыных яек).

Гарбузы баяцца замаразкаў, таму ў пачатку кастрычніка мы часам загадзя здымаем плады, і яны ў нас даспяваюць у цёплым склепе. Гарбуз любіць цяпло.

Але ў анамальна спякотнае лета на першым лісці гэтай выдатнай расліны можа з'явіцца жаўцізна — тады яго трэба выдаляць.

У чым жа прычына?

• Няправільны паліў у спякотны час. Гарбуз варта паліваць толькі пад корань! У спякоту пры паліве лісця зверху яно часта атрымлівае апёк, гэта значыць, на лісці з'яўляюцца «карычневыя малюнкі». Таксама непажаданы вячэрні паліў зверху. Вядома, што на ноч гэтыя расліны не павінны заставацца мокрымі, каб не падчапіць грыбок і не захварэць (адна з прыкмет гэтай хваробы — пажоўкласць ліставых пласцін). Грыбок актыўны менавіта пры высокай вільготнасці.

Каб пазбавіцца гэтага, гарбуз варта апырскаць растворам фунгіцыду («Фітаспарын М», «Фундазол», «Поліграм» і іншымі). Я ж раю праверaны народны рэцэпт — раствор з харчовай соды. Ад яго не будзе шкоды ні для чалавека, так і для насякомых-апыляльнікаў. Але затое ён згубны адназначна для патагенных грыбоў з-за сваёй шчолачнай уласцівасці. Для падрыхтоўкі гэтага сродку спатрэбіцца: 1 шклянка соды, 10 літраў вады і некалькі лыжак вадкага мыла (для паляпшэння прыліпання).

У мэтах прафілактыкі спецыялісты рэкамендуюць апырскваць гарбузовыя расліны гэтым растворам адзін раз на два тыдні. Пры наяўнасці захворвання апырскванне трэба рабіць штотыдзень.

Буйнаплодныя і мускатныя гарбузы радуюць нас кожны год, багаты ўраджай збяром і гэтай восенню.

**Яўген САЛАНОВІЧ,**
**дачнік са шматгадовым стажам.**

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПАКАШТУЙЦЕ!

## КІСЛА-САЛОДКІ ПЕРАЦ

**Гэтыя перцы ідэальна падыдуць у якасці гарніру да любых страў, асабліва мясных.**



***Спатрэбіцца:*** *салодкі перац — 1 кг, часнок — 2 зубкі, алей — 50 г, кіпень — 150 мл, цукар — 2 ст. л., воцат — 50 мл, соль — 1 ст. л.*

Перцы ачысціць ад насення і нарэзаць буйной саломкай. Разагрэць алей з расціснутымі зубкамі часнаку. Дадаць перцы і абсмажыць на сярэднім агні 3-4 хвіліны. Пасаліць, дадаць ваду, закрыць накрыўкай, зменшыць агонь і патушыць 10-15 хвілін. Адкрыць накрыўку і гатаваць яшчэ 5 хвілін, каб выпарылася лішняя вадкасць. Дадаць цукар і воцат, павялічыць агонь да максімуму і гатаваць пару хвілін. Падаваць ахалоджаным.

## КРАМБЛ З ЯБЛЫКАМІ

**Крамбл — дэсерт, які нагадвае пірог, з сакавітай начынкай і крошкай, што выконвае ролю цеста. Звычайна ён падаецца цёплым у той форме, у якой запякаўся. Можна прыгатаваць і парцыённыя варыянты.**

Спатрэбіцца: яблыкі — 6-7 штук, цукар — 100 г, карыца — 1 ст. л.; для крошкі: масла — 80 г, мука — 100 г, аўсяныя шматкі — 100 г, цукар — 100 г.



Яблыкі ачысціць і нарэзаць невялікімі кубікамі. Дадаць цукар і карыцу. Змяшаць і выкласці на дно формы. Для крошкі масла растапіць і змяшаць з сухімі інгрэдыентамі. Пасыпаць крошкай яблыкі і выпякаць у духоўцы пры 180 °С 30 хвілін. Падаваць з шарыкам марожанага.

УМЕЛЫЯ РУЧКІ

## МАСАЖНЫ ДЫВАНОК З КАШТАНАЎ ДЛЯ НОГ

**Каштаны маюць цвёрдую структуру, круглявую і ў той жа час няроўную форму — ідэальны варыянт для лячэбнай гімнастыкі ступняў. Гэты масажна-артапедычны дыванок спадабаецца і дзецям, і дарослым. А зрабіць яго лёгка. Галоўнае — наяўнасць каштанаў.**

***Спатрэбіцца:*** *каштаны; тонкая лёска, нажніцы, электрадрыль з тонкім свердзелам.*

Робім у каштанах электрадрыллю па дзве перпендыкулярныя скразныя адтуліны.

Разразаем лёску на роўныя адрэзкі з разлікам на шырыню і даўжыню дыванка і нанізваем на іх каштаны.

Тут магчымыя два варыянты выканання:

• Робім доўгія адрэзкі па гарызанталі, нанізваем каштаны, складаем рады разам і злучаем іх паміж сабой кароткімі адрэзкамі лёскі па вертыкалі (працсей нанізваць каштаны, але збоку будуць тырчаць хвосцікі ад лёскі).

• На адзін доўгі адрэзак лёскі нанізваем усе каштаны, а потым выкладваем звілістай «змейкай» адразу ўвесь дыванок па шырыні, затым прасоўваем роўныя адрэзкі лёскі па ўсёй даўжыні дыванка (больш працаёмка, але затое выглядае больш акуратна).

Для прыгажосці і сіметрычнасці дыванка ў радах па шырыні і даўжыні абавязкова павінна быць аднолькавая колькасць каштанаў.

Пасля таго як працягнулі лёску па шырыні і даўжыні, хвосцікі лёскі на канцах дыванка звязваем паміж сабой звычайнымі вузламі.



*БРАТ ЗБОКУ, А СУСЕД ЗДАЛЁКУ (Беларуская народная прымаўка).*

Кінамеханіка

# У КАДРЫ — ФЕСТЫВАЛІ

***Ад рэдакцыі.*** **Нягледзячы на тое, што ў эпоху каранавіруса публікі ў кінатэатрах паменшала, кіно працягвае жыць і здзіўляць нас, у тым ліку і беларускае. Што адбываецца ў кінамастацтве Беларусі і ўсяго свету, чытайце ў новай рубрыцы «Звязды», якую пачынае на нашых старонках вядучы рэдактар кінастудыі «Беларусьфільм» Тацццяна КОМАНАВА.**

Восеньскае кінанадвор'е, як і сінаптычнае, любіць падкінуць неспадзяванак. І пакуль айчынны «Лістапад» яшчэ не набыў якіх-кольвек новых абрысаў, культурная суполка разважае, чым ён будзе адрозніваця пасля змены свайго галоўнага арганізатара. Безумоўна, акцэнты форуму зменяцца заўважным чынам. Але ці паўплываюць як-небудзь гэтыя змены на вытворчасць айчынных фільмаў? Ці чакаць нам, што Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм» прад'явіць публіцы новае беларускае кіно? Ці, магчыма, нашы кінематаграфісты натхняцца кінематографам сусветным і пачнуць падыходзіць да беларускага кінапрацэсу па-іншаму?

Кожны можа назваць «тры кіты» кінафестывальнай прасторы: Каны, Венецыя і Берлін. Буйныя міжнародныя фестывалі, што праходзяць у гэтых гарадах, сфакусіраваныя на тым, што фарміруюць пэўныя трэнды: Берлінале — у кірунку сацыяльных і палітычных выказванняў, Венецыянскі аддае перавагу так званаму высокаму арт-хаусу, Каны абіраюць эталоны кіно, умоўна альтэрнатыўнага галівудскаму... Кожны з гэтых форумаў, разам з Манрэалем, Лакарна, Сан-Себасцьянам, Масквой, Карлавымі Варамі, Шанхаем і шэрагам іншых кінагарадоў, фарміруюць так званы найвышэйшы эшалон экранных твораў, на які сучасная кііндустрыя мусіць раўняцца. І ў пэўны момант можа скласціся ўражанне, што варта толькі здолець трапіць у праграму такога буйнога кінафоруму — і далейшы творчы поспех табе забяспечаны аўтаматычна.

Але рэальнасць выглядае іначай, заклікаючы звярнуць больш увагу на прынцыпова іншы тып форумаў накшталт Пекінскага кінафестывалю, які адзінаццаты раз прайшоў у кітайскай сталіцы і гэтым разам адбыўся з 17 да 30 верасня. Адметнасць гэтага кінафоруму: хоць 300 карцін і ўвайшлі ў сёлетнія паказы, нельга гаварыць, што ўвага больш засяроджаная на замежных стужках. Арганізатары лічаць аднолькава важным як сабраць панараму найбольш цікавага сусветнага кіно, так і найлепшым чынам прадставіць разнажанравую палітру айчынных кітайскіх стужак. І гэта аніякім чынам не ўспрымаецца як хітрае «лабіраванне» ўласнага кінапрадукту — міжнародны кінагрмадскасці адкрыта даводзіцца, што тут, у Пекіне, яны могуць самі скласці ўласнае ўражанне, што цікавага з'явілася апошнім часам на экранах Паднябеснай.

Думаецца, што для таго, каб сучаснае беларускае кіно атрымала для свайго развіцця добры прафесійны... ці то імпульс, ці то выспятак, не трэба пад выглядам уласнай сціпласці баяцца станавіцца ў адзін шэраг з замежнымі стужкамі. Сёння, наадварот, найбольш важна выцягваць на святло ўсю стракатасць айчыннага кінапрадукту, які ў пэўных праявах можа быць сырым, наіўным ці, наадварот, залішне заштампаваным. Але ён мусіць выходзіць на суд гледачоў, бо толькі так можа займець які-кольвек шанц на тое, каб развівацца.

Дык чаго ж варта чакаць ад «Лістапада», да пачатку якога засталося менш за два месяцы? На мой погляд, у самай меншай ступені істотна, хто непасрэдна і якія ўзнагароды атрымае. Бо пакуль што ніводзін, нават самы «залаты», дыплом айчыннага кінафоруму не аказвае ўплыву на будучыя вытворчыя бюджэты беларускіх фільмаў. А вось узнікненне «свежага» кола прафесіяналаў, якое створыць прастору для абмеркавання айчыннага кіно, — істотна. І няма сумневу, што размоў, чаго не хапае беларускаму кіно сёння, падчас «Лістапада» будзе дастаткова. Толькі хацелася б, каб з гэткай жа інтэнсіўнасцю і імпэтам айчынныя кінадзеячы абмяркоўвалі, што ў сучасным айчынным кіно вартае, каб быць заўважаным. І пры якіх умовах гэтыя кіназнарняты могуць прынесці годны ўраджай. Без гэтага любы фестываль застанецца ўсяго толькі кінапраглядам для пэўнага кола. Пры тым, што сёння «Лістапад» мае ўсе шанцы стаць мастацкім нівелірам для новага беларускага кіно.

**Таццяна КОМАНАВА.**

# ІНАВАЦЫІ Ў КНІЖНАЙ ПРАСТОРЫ: ДАРОГА Ў ЗАЎТРА

**На пачатку восені на пасаду дырэктара аднаго з найбольш буйных выдавецтваў краіны «Адукацыя і выхаванне» прыйшоў Валянцін НАВАГРОДСКІ. У інтэрв'ю газеце «Звязда» ён распавёў пра напрамкі работы выдавецтва, пра магчымасці, якія прыносіць выданне кніг з дапоўненай рэальнасцю для дзяцей і дарослых, падзяліўся планамі на найбліжэйшую будучыню.**



***— Валянцін Янавіч, раней вы ўзначальвалі вучэбна-выдавецкі цэнтр БДПУ. З улікам гэтага прафесійнага вопыту якія задачы бачыце найперш як прыярытэтныя, распачынаючы працу ў «Адукацыі і выхаванні»?***

— Асновай усіх калектываў у любой галіне з'яўляюцца людзі — каманда на першым месцы. Перш за ўсё, хочацца захаваць і прымнохыць творчы патэнцыял супрацоўнікаў выдавецтва, нарасціць магутнасці і выйсці на якасна новы ўзровень работы, запусціць цікавыя праекты ў рэчышчы інавацыйных тэхналогій і падыходаў да выдання кніжнай прадукцыі. Галоўнае — дынаміка ў камандзе, ацэнка здольнасцяў кожнага спецыяліста і перспектыўнасць праектаў. Мы накіраваныя на развіццё!

***— На сайтах выдавецтва прадстаўленыя добра выдадзеныя кнігі розных жанраў: ад дзіцячых казак да гістарычных выданняў, вучэбнай і вучэбна-метадычнай літаратуры. Ці плануецца змяненне кірункаў? На чым збіраецеся рабіць акцэнты?***

— Як вынікае з назвы выдавецтва, нашым прыярытэтам з'яўляюцца кнігі для дзяцей і моладзі, якія спрыяюць якаснай адукацыі і выхаванню, фарміраванню грамадзянскасці, патрыятызму, любові да Радзімы і гонару за нашу багатую культурную спадчыну. Гэта і мастацкая, і навукова-папулярная літаратура, і, вядома, вучэбныя выданні. Азначаны вектар застанецца для нас ключавым.

Яшчэ адзін важны элемент нашай дзейнасці — падтрымка творчых педагогаў. Менавіта ім адрасаваныя ўнікальная серыя навукова-метадычных часопісаў «У дапамогу педагогу» (яна пачыналася, як і выдавецтва, з часопіса «Адукацыя і выхаванне»), часопісы «Пралеска», «Пачатковая школа» і «Роднае слова», а таксама вучэбна-метадычная літаратура па розных прадметных галінах. Наша мэта — знайсці цікавыя ідэі, вызначыць канцэпцыю канчатковага прадукту і паспяхова ўвасобіць у жыццё.

***— Якім крытэрыям павінна адпавядаць выдадзеная літаратура?***

— Гэта павінны быць кнігі, напісаныя высокапрафесійнымі аўтарамі і, безумоўна, якасна выдадзеныя. Калі гаворка ідзе пра вучэбна-метадычную і вучэбную літаратуру, то самы важны крытэрый — запатрабаванасць гэтага прадукту. І, вядома, адпаведнасць стандартам Міністэрства адукацыі і Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

***— Што, на ваш погляд, дапаможа выдавецтву атрымаць дадатковыя канкурэнтныя перавагі на кніжным рынку? На што будзе рабіцца стаўка?***

— Мы развіваем вельмі перспектыўны, папулярны і сучасны кірунак — уключэнне ў кнігі і некаторыя часопісы тэхналогіі дапоўненай рэальнасці, што пры шырокай даступнасці інтэрнэту і мабільных гаджэтаў прывабна і карысна для пакупнікоў, падпісчыкаў, калег. Скарыстацца ўсімі перавагамі інавацыі дазваляе бясплатны дадатак для мабільных прылад «AiV — ДОПОЛНЕННАЯ РЕАЛЬНОСТЬ». Пагадзіцеся, выдатна, калі юны чытач, адкрыўшы, напрыклад, падручнік па біялогіі або развіццёвую кнігу пра старажытную гісторыю, пра этыкет, авіяцыю і паветраплаванне, можа адразу на старонках кнігі запусціць кароткі відэаролік з самалётамі або парадамі па падрыхтоўцы дзіцячага свята, агучаны ўнікальным голасам аўтара, або павялічыць і круціць 3D-макет жывёлы... Так пашыраюцца магчымасці друкаванага выдання, а зацікаўленасць чытача ўздымаецца на новы ўзровень.

У хуткім часе мы плануем запусціць новы праект i-AiV, але пра яго раскажам пазней. Пакуль яшчэ знаходзімся ў працэсе распрацоўкі.

***— А як ажыццяўляецца сувязь са спажыўцамі прадукцыі выдавецтва? Ці ёсць магчымасці для зваротнай сувязі?***

— Камунікацыя займае ключавую пазіцыю ў поспеху выдавецтва. Для сувязі са спажыўцамі ў нас ёсць шырокі дыяпазон інструментаў. Перш за ўсё, мы аператыўна інфармуем людзей пра навінкі і інавацыі на сайтах выдавецтва, у сацыяльных сетках (Instagram, Facebook, VK, «Одноклассники»), запрашаем на мерапрыемствы, адказваем на каментарыі і паведамленні ў сацсетках і на лісты, якія прыходзяць на пошту выдавецтва, робім масавыя рассылкі для ўстаноў адукацыі, паспяхова практыкуем выязныя прэзентацыйныя мерапрыемствы.

***— Што можна зрабіць для прыцягнення таленавітых аўтараў?***

— Мне падабаецца такі прынцып: «Верце ў людзей больш, чым яны самі вераць у сябе, і падахвочвайце іх тварыць!» Мы імкнёмся даць шанц як маладым і невядомым, так і дасведчаным знакамітым пісьменнікам.

Распрацоўваем новую стратэгію заахвочвання, падтрымкі талентаў. І першым крокам стала ўрачыстае ўручэнне прэмій топ-10 самых папулярных нашых аўтараў у сегментах вучэбнай, навукова-папулярнай і мастацкай літаратуры на цырымоніі адкрыцця кніжнага магазіна выдавецтва ў ГЦ «Сталіца» 29 верасня, напярэдадні Дня настаўніка. Да гэтага свята, якое сёлета адзначылі 3 кастрычніка, выдавецтва правяло акцыю: усе ахвотныя змаглі набыць кніжную прадукцыю з 20-працэнтнай зніжкай па промакодзе «310».

***— Ці магчымае пашырэнне тэматычнага спектра літаратуры, якая выходзіць у выдавецтве?***

— Да вялікай сям'і дзіцячых часопісаў выдавецтва «Адукацыя і выхаванне» нядаўна далаліся два беларускамоўныя — «Вясёлка» і «Буся». Гэта не толькі адкрывае нам новыя гарызонты, павялічвае чытацкую аўдыторыю выдавецтва, але і накладвае дадатковую адказнасць па выхаванні юных беларусаў дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту.

***— Якіх наваўвядзенняў можна чакаць і якія сустрэчныя ініцыятывы вы б віталі?***

— Для паспяховай работы выдавецтва ў нас ёсць шмат чаго. І перш за ўсё гэта высакакласныя спецыялісты ў сферы кнігавыдання, аўтарытэтныя аўтары і сучасныя выдавецкія платформы. Актыўна працуюць нашы сайты, старонкі і групы ў сацыяльных сетках. Мы ў пастаянным пошуку новых праектаў і прымаем да разгляду ўсе ініцыятывы і прапановы. Вядома, вітаем з'яўленне новых імёнаў, але трэба разумець, што аўтару варта азнаёміцца з кніжным асартыментам выдавецтва, перад тым як звярнуцца да нас. У прыярытэце — творчыя педагогі ўсіх ступеняў адукацыі.

***— Як, на ваш погляд, можна ўзмацніць патэнцыял навукова-метадычных часопісаў, якія выходзяць у выдавецтве «Адукацыя і выхаванне»? Што плануеце распачаць для павелічэння ахопу чытацкай аўдыторыі?***

— Інфармацыйная прастора сёння насычаная і нават перанасычаная. Але часцей за ўсё ў педагога за штодзённай руцінай банальна не хапае часу для якаснага самаразвіцця, што можа адбіцца на прафесійным росце.

Мы імкнёмся дапамагчы вырашыць гэтыя праблемы шматвектарна. Працэс уключае работу з галоўнымі рэдактарамі выданняў, павелічэнне шчыльнасці і тэмпу падачы матэрыялу з улікам эфекту «кліпавага мыслення», што асабліва важна для маладых спецыялістаў. Як паказвае практыка, высокая шчыльнасць і сціслась тэксту папулярныя і сярод школьнікаў. Таму так запатрабаваныя нашы кнігі серый «Жывая гісторыя», «Гісторыя ў асобах», «99 захапляльных фактаў» і іншыя.

***— Вы атрымалі вышэйшую адукацыю на гістфаку БДПУ. Гэта паўплывала на вашы кніжныя перавагі? Якія кнігі вы чыталі ў дзяцінстве і юнацтве, якія жанры цікавяць вам цяпер? Кнігі якіх аўтараў вы ахвотна ўнеслі б у лінейку прадукцыі выдавецтва?***

— Як і многія мае сябры, я з вялікім захапленнем чытаў гістарычныя творы «Хрыстос прызямліўся ў Гародні», «Чорны замак Альшанскі», «Дзікае паляванне караля Стаха» Уладзіміра Караткевіча, а яшчэ — «Трэцяе пакаленне», «Пошукі будучыні» Кузьмы Чорнага, «Граф Монтэ-Крыста», «Чорны цюльпан», «Тры мушкецёры» Аляксандра Дзюма. Вельмі цікавіўся мастацкай літаратурай па тэме Вялікай Айчыннай вайны. Гэтая тэма блізкая мне і сёння.

І я з гонарам хачу паведаміць, што сумесна з Музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны мы рыхтуем да выдання значны праект — «Памятныя мясціны Беларусі». Супрацоўнікі музея разам з аўтарамі і супрацоўнікамі выдавецтва стварылі ўнікальную кнігу, на старонках якой адлюстравана трагедыя беларускага народа ў ваенные ліхалецце.

***— Дзе сёння можна знайсці прадукцыю выдавецтва?***

— У нашых інтэрнэт-крамах, у кіёскаіх выдавецтва, амаль у кожнай кнігарні краіны. Найперш — у сетцы кнігарань «Белкнігі», таксама — у «Акадэмкнізе» ў Мінску. Актыўна працуем з прыватнымі кнігагандлярамі. Вельмі шмат намаганняў прыкладаем для рэкламы кніг, нашых навінак у сацыяльных сетках, у электронных медыя. Сачыце за інфармацыяй, набывайце нашы кнігі, выказвайце свае меркаванні пра іх. Будзем толькі ўдзячны!

**Гутарыў Ігнат МАКСІМАЎ.**

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.

Продавец: **ОАО «АП г. Барановичи»** (УНП 290237319), 225417, г. Барановичи, ул. Тельмана, 102-2, тел. +375 (163) 68-18-91.

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены **20 октября 2021 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

Прием заявок и задатков – с 08.10.2021 г. 09.00 по 19.10.2021 г. 17.00. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 19.08.2021 г.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Автобус-вагон Mercedes-BenzSprinterClassic 311 CDI-SBA, 2018 г. в., с инв. № 10510, гос. номер АМ6299-1 | 57 726,79 |
| 2 | Автобус-вагон Mercedes-BenzSprinterClassic 311 CDI-SBA, 2018 г. в., с инв. № 10570, гос. номер АМ6296-1 | 57 726,80 |
| 3 | Автобус-вагон Mercedes-BenzSprinterClassic 311 CDI-SBA, 2018 г. в., с инв. № 10540, гос. номер АМ6295-1 | 58 363,79 |

Публичные торги в электронной форме будут проведены: **08 ноября 2021 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.** Прием заявок и задатков – с 08.10.2021 г. 09.00 по 05.11.2021 г. 17.00.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Автопоезд (Автомобиль грузовой седельный тягач MAZ 5440 M9, 2018 г. в., инв. № 55050, гос. № АМ 6442-1). Полуприцеп (платформа тентовая MAZ 9755830-3061, 2018 г. в., инв. № 55150, гос. № А 5934 Е-1) | 148 844,12 |

**Местонахождение предметов торгов – г. Барановичи, ул. Тельмана, 102-2. Тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.**

**Для участия в торгах необходимо в указанный срок:** 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов: не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона/ оператор | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46, www.ipmtorgi.by** |
| Продавец | **ООО «БелВЭБ Капитал», г. Минск, ул. Карла Либкнехта, д. 66, пом. 21а, комн. 1** |
| **Предмет электронных торгов** | |
| **Лот № 1: Капитальные строения, реализуемые одним лотом, по адресу:** Минская обл., г. Молодечно, ул. Виленская, 10, 10Б (**Здание банка,** общ. пл. 581,7 кв. м, инв. номер 630/С-18374, **Здание гаража на 3 автомобиля,** общ. пл. 58,1 кв. м, инв. номер 630/С-47339, **Здание архива, склада, служебного кабинета и комнаты отдыха,** общ. пл. 107,4 кв. м, инв. номер 630/С-39886) | |
| **Сведения о земельном участке:** 1) предоставлен на праве постоянного пользования, общ. пл. 0,3542 га, для содержания и обслуживания зданий и сооружений по ул. Виленской, 10 в г. Молодечно; 2) предоставлен на праве постоянного пользования, общ. пл. 0,0225 га для содержания и обслуживания административно-хозяйственного здания | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 1 226 670,17 бел. руб.** | |
| **Лот № 2: Здание банка,** общ. пл. 784 кв. м, инв. номер 240/С-34300 по адресу: Витебская обл., г. Орша, ул. Мира, д. 30. **Сведения о земельном участке:** пл. 0,2784 га, предоставлен продавцу для использования под здание офиса на праве постоянного пользования | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 1 057 242,16 бел. руб.** | |
| **Лот № 3: 1/10 доли в праве собственности на капитальное строение** с общ. пл. капитального строения 2486,7 кв. м, инв. номер 422/С-3271, по адресу: г. Щучин, ул. Пушкина, 26. **Сведения о земельном участке:** пл. 0,5681 га, предоставлен продавцу для содержания и обслуживания административного здания на праве постоянного пользования (доля 1/10) | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 41 344,03 бел. руб.** | |
| **Лот № 4: Гараж № 10** (Здание специализированное автомобильного транспорта (гараж кирпичный) общей площадью 49,3 кв. м, инвентарный номер 342/С-32185) по адресу: Гомельская обл., г. Светлогорск, ул. Привокзальная, в районе базы УКСа, гараж № 10. **Сведения о земельном участке:** пл. 0,0070 га, предоставлен продавцу для размещения автостоянок и гаражей на праве постоянного пользования | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 26 971,10 бел. руб.** | |
| **Лот № 5: Административное помещение № 3,** общ. пл. 1 112 кв. м, инв. номер 500/D-687333, по адресу: г. Минск, ул. Гуляма Якубова, д. 10, пом. 3 | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 2 490 437,88 бел. руб.** | |
| **Лот № 6: Здание банка,** общ. пл. 721 кв. м, инв. номер 130/С-26337, по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Брестская, 9. **Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве постоянного пользования, общ. пл. 0,0422 га для обслуживания административного здания | |
| **Ограничения (обременения)** прав на недвижимое имущество, установленные в связи с присвоением ему статуса памятника историко-культурного наследия. Новый собственник материальной историко-культурной ценности обязан в течение тридцати календарных дней со дня приобретения права собственности подписать охранное обязательство. Невыполнение этого требования является основанием для признания сделки недействительной | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 930 090,00 бел. руб.** | |
| **Лот № 7: Изолированные помещения, реализуемые одним лотом, по адресу:** г. Минск, ул. Скрыганова, 6 (пом. 3, 5, 16, 7, 14, 12, 2, 13, 9, 11, 10, 6/3-17, 6/3-18, 6/3-19, 6): **1. Изолированное помещение технического этажа,** общ. пл. 628,9 кв. м, инв. номер 500/D-7115208. **2. Изолированное помещение машинного отделения в административном здании,** общ. пл. 78 кв. м, инв. номер 500/D-7115210. **3. Изолированное помещение в подвале административного здания** общ. пл. 20,1 кв. м, инв. номер 500/D-7115345. **4. Изолированное помещение в подвале административного здания,** общ. пл. 96,8 кв. м, инв. номер 500/D-7115212. **5. Изолированное помещение на 1-м этаже административного здания,** общ. пл. 6,3 кв. м, инв. номер 500/D-7115219, **6. Изолированное помещение на 1-м этаже в административном здании,** общ. пл. 5,2 кв. м, инв. номер 500/D-7115217. **7. Изолированное помещение на 1-м этаже в административном здании,** общ. пл. 134,2 кв. м, инв. номер 500/D-7115207. **8. Изолированное помещение на пятом этаже административного здания,** общ. пл. 14,3 кв. м, инв. номер 500/D-7115218. **9. Изолированное помещение 6-го этажа в административном здании,** общ. пл. 568,9 кв. м, инв. номер 500/D-7115214. **10. Изолированное помещение 7-го этажа в административном здании,** общ. пл. 567,6 кв. м, инв. номер 500/D-7115216. **11. Изолированное помещение 9-го этажа в административном здании,** общ. пл. 568,5, инв. номер 500/D-7115215. **12. Нежилое помещение в подвале в административном здании,** общ. пл. 331 кв. м, инв. номер 500/D-798802009. **13. Нежилое помещение на 1-м этаже в административном здании** общ. пл. 406,5 кв. м, инв. номер 500/D-798802010. **14. Нежилое помещение на 2-м этаже в административном здании,** общ. пл. 570,3 кв. м, инв. номер 500/D-798802011. **15. Изолированное помещение на 5-м этаже в административном здании,** общ. пл. 453,6 кв. м, инв. номер 500/D-7115211 | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 10 877 126,88 бел. руб.** | |
| Дополнительная информация: 1. Обременения по лотам №№ 1–7: объекты находятся в залоге у ОАО «Банк БелВЭБ». 2. В состав лотов №№ 1, 2, 5, 6, 7 входит иное имущество. Перечень имущества размещен на сайте www.ipmtorgi.by. 3. Обременения: аренда по лотам №№ 1, 2, 5, 6, 7. Подробная информация у Продавца | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях (BYN) перечисляется на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638 | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять)** рабочих дней после электронных торгов |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | |
| **Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение от 1 до 5 % от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов | |
| Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия | |
| Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете "Звязда" от 01.07.2021 г. | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** Начало торгов: **10.00 21.10.2021 г.** Окончание торгов: **12.00 21.10.2021 г.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов | |
| **Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **19.10.2021 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by | |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (29)-317-95-42; +375 (44) 704-92-06 E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by** |

## ИЗВЕЩЕНИЕ

## ГОСУДАРСТВЕННОЕ ПРОИЗВОДСТВЕННОЕ ОБЪЕДИНЕНИЕ «МИНСКСТРОЙ»

доводит до сведения заинтересованных лиц

## О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ И ДОПОЛНЕНИЙ

в проектную декларацию о строительстве жилых помещений и машино-мест в составе объекта

**«Комплексный проект застройки жилой территории в границах улиц Притыцкого, Скрипникова, Одинцова, Лобанка (микрорайон № 3)». Жилые дома №№ 24а, 24б по генплану. Очередь строительства 5.1. Жилой дом № 24а по генплану, гараж-стоянка 24а-1 по генплану**, *опубликованную в газете «Звязда» от 27.08.2021 № 164 (29533) в редакции извещения о внесении изменений и дополнений от 15.09.2021 № 177 (29546):*

**Объект долевого строительства – квартира с машино-местом.**

**Сведения об этапах строительства и сроках его реализации:**

Срок начала строительства объекта – 30 июля 2021 года.

